ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 40 (899) | Субота, 4 кастрычніка 1952 года | Цана 50 кап.

Заўтра ў Маскве адкрываецца чарговы XIX з'езд ВКП(б).

Слава партыі Леніна—Сталіна, арганізатару сусветна-гістарычных перамог совецкага народа!

Слава таварышу Сталіну—вялікаму зодчаму комунізма!

Вялікі ўклад у тэорыю марксізма-ленінізма

Сёння ў «Правде» перадрукоўваецца з часопіса «Большевик» твор таварыша І. В. Сталіна «Эканамічныя праблемы соцыялізма ў СССР». У гэтым новым класічным творы аб'яднаны работы таварыша Сталіна па эканамічных пытаннях, якія звязаны з лістападаўскай дыскусіяй 1951 г.

Твор таварыша Сталіна «Эканамічныя праблемы соцыялізма ў СССР» з'яўляецца вялікім укладам у тэорыю марксізма-ленінізма. Гэтая новая тэарэтычная праца таварыша Сталіна — яскравы прыклад непарыўнага адзінства рэволюцыйнай тэорыі і рэволюцыйнай практыкі. Гэты навуковы твор велізарнай тэарэтычнай і практычнай важнасці мае буйнейшае міжнароднае значэнне.

Абагульняючы вопыт соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР і міжнароднага рэволюцыйнага руху, таварыш Сталін сваімі глыбокімі даследваннямі карэнных праблем сучаснасці няспынна ўзбагачае тэорыю марксізма-ленінізма новымі навуковымі палажэннямі і вывадамі. Працы таварыша Сталіна ўказваюць совецкім людзям шлях да поўнай перамогі комунізма, натхняюць працоўных краін народнай дэмакратыі на слаўныя подзвігі ў будаўніцтве соцыялізма, клічуць працоўных усяго свету на барацьбу за мір, дэмакратыю і соцыялізм.

Новыя тэарэтычныя работы таварыша Сталіна публікуюцца ў знамянальныя дні, калі наша партыя, увесь совецкі народ з велізарным уздымам ідуць насустрач XIX з'езду ВКП(б), які вызначыць задачы партыі на сучасным гістарычным этапе.

«Цяпер, — гаворыцца ў праекце змененага Статута партыі, — галоўныя задачы Комуністычнай партыі Совецкага Саюза заключаюцца ў тым, каб набудаваць комуністычнае грамадства шляхам паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма, няспынна павышаць матэрыяльны і культурны ўзровень грамадства, выхоўваць членаў грамадства ў духу інтэрнацыяналізма і ўстанаўлення брацкіх сувязей з працоўнымі ўсіх краін, усямерна ўмацоўваць актыўную абарону Совецкай Радзімы ад агрэсіўных дзеянняў яе ворагаў».

У творы «Эканамічныя праблемы соцыялізма ў СССР» таварыш Сталін усебакова распрацаваў карэнныя пытанні палітычнай эканоміі соцыялізма, упершыню ў марксісцкай літаратуры даў аналіз характару яго эканамічных законаў, сфармуляваў асноўны эканамічны закон соцыялізма і вызначыў асноўныя ўзовы паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма. Творча развіваючы вучэнне Маркса, Энгельса, Леніна, таварыш Сталін нанёс сакрушальны ўдар па розных антымарксісцкіх поглядах, падверг крытыцы памылковыя сцверджанні асобных эканамістаў.

Таварыш Сталін раскрыў характар і дзеянне эканамічных законаў соцыялізма, якія з'яўляюцца аб'ектыўнымі законамі, што адлюстроўваюць працэсы эканамічнага развіцця, якія адбываюцца незалежна ад волі людзей. Людзі могуць адкрыць законы прыроды і грамадства, пазнаць іх, вывучыць іх, улічваць іх у сваіх дзеяннях, скарыстаць іх у інтарэсах грамадства, але яны не могуць знянаць або скасаваць іх. Таму глыбока няправільнымі з'яўляюцца ўяўленні аб тым, што ва ўмовах соцыялізма людзі могуць знішчаць эканамічныя законы і ствараць па сваёй волі другія або «пераўтвараць» іх. Эканамічныя законы, вучыць таварыш Сталін, не знішчаюцца, а губляюць сілу ў сілу новых эканамічных умоў і сходзяць са сцэны, каб уступіць месца новым законам, якія не ствараюцца веляй людзей, а ўзнікаюць на базе новых эканамічных умоў.

Аднак грамадства не бяссільна перад тварам законаў, яно можа, пазнаўшы эканамічныя законы і абапіраючыся на іх, скарыстаць іх у інтарэсах грамадства. Сцяганосцам скарыстання эканамічных законаў у інтарэсах грамадства заўсёды і ўсюды з'яўляецца перадавы клас, тады як аджываючыя класы аказваюць гэтаму супраціўленне. Патрэбна грамадская сіла, якая здольна пераадолець гэтае супраціўленне. Такая сіла знайшлася ў нашай краіне ў выглядзе саюза рабочага класа і сялянства. У гэтым сакрэт таго, што Совецкай уладзе ўдалося разбіць старыя сілы грамадства, а эканамічны закон абавязковай адпаведнасці вытворчых адносін характару прадукцыйных сіл атрымаў у СССР поўную прастору. Абапіраючыся на эканамічны закон абавязковай адпаведнасці вытворчых адносін характару прадукцыйных сіл, указвае таварыш Сталін, Совецкая ўлада абагуліла сродкі вытворчасці, зрабіла іх уласнасцю ўсяго народа і тым знішчыла сістэму эксплуатацыі, стварыла соцыялістычныя формы гаспадаркі. Не будзь гэтага закона і не абапіраючыся на яго, Совецкая ўлада не змагла-б выканаць сваёй задачы.

Найвялікшае значэнне мае адкрыццё таварышам Сталіным асноўнага эканамічнага закона соцыялізма.

«Істотныя рысы і патрэбаванні асноўнага эканамічнага закона соцыялізма, — вучыць таварыш Сталін, — можна было-б сфармуляваць прыкладна такім чынам: забяспечанне максімальнага задавальнення пастаянна растучых матэрыяльных і культурных патрэб усяго грамадства шляхам няспыннага росту і ўдасканалення соцыялістычнай вытворчасці на базе вышэйшай тэхнікі».

Гэтае вызначэнне раскрывае самую глыбокую сутнасць соцыялізма, яго прыроду. У ім падкрэслена мэта соцыялістычнай вытворчасці і ўказаны сродак дасягнення гэтай мэты. Асноўны эканамічны закон соцыялізма выражае вялікія перавагі соцыялізма перад капіталізмам. Мэтай соцыялістычнай вытворчасці з'яўляецца не прыбытак, а чалавек з яго патрэбамі. Соцыялістычная вытворчасць падпарадкавана асноўнай мэце—забяспечанню максімальнага задавальнення пастаянна растучых матэрыяльных і культурных патрэб усяго грамадства.

Выходзячы з патрабаванняў асноўнага эканамічнага закона соцыялізма, партыя накіроўвае развіццё эканомікі па шляху няўхільнага ўздыму, забяспечвае паспяховае выкананне народнагаспадарчых планаў. Праект дырэктыў XIX з'езда партыі па пятаму пяцігадоваму плану развіцця СССР на 1951—1955 гады навочна адлюстроўвае патрабаванні асноўнага эканамічнага закона соцыялізма, адкрытага і навукова абгрунтаванага таварышам Сталіным.

«Пяты пяцігадовы план, — указваецца ў праекце дырэктыў, — вызначае новы магутны ўздым народнай гаспадаркі СССР і забяспечвае далейшы значны рост матэрыяльнага добрабыту і культурнага ўзроўню народа.

Выкананне пятага пяцігадовага плана з'явіцца буйным крокам уперад па шляху развіцця ад соцыялізма да комунізма».

Распрацоўваючы асноўныя пытанні палітычнай эканоміі соцыялізма, таварыш Сталін усебакова высветліў асаблівасці таварнай вытворчасці пры соцыялізме. Ён зрабіў важны навуковы вывад аб тым, што пры соцыялізме мае месца асобага роду таварная вытворчасць, таварная вытворчасць без капіталістаў, якая мае справу ў асноўным з таварамі аб'яднаных соцыялістычных вытворцаў. Сфера дзеяння гэтай таварнай вытворчасці абмежавана прадметамі асабістага ўжытку. Таварыш Сталін растлумачыў, што сродкі вытворчасці пры соцыялізме нельга падводзіць пад катэгорыю тавара. Неабходнасць пры соцыялізме таварнай вытворчасці асобага роду абумоўлена наяўнасцю двух асноўных форм соцыялістычнай вытворчасці—дзяржаўнай (агульнанароднай) і калгаснай.

У адрозненне ад капіталізма таварная вытворчасць пры соцыялізме не вядзе да ўзнікнення капіталістычных адносін. Яна пастаўлена ў строгія рамкі дзякуючы такім рашаючым умовам, як грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці, ліквідацыя сістэмы наёмнай працы і эксплуатацыі. Даследванне тавэрнай вытворчасці і закона вартасці пры соцыялізме таварыш Сталін звязвае з практычнымі задачамі соцыялістычнага гаспадарання, з рэнтабельнасцю, гаспадарчым разлікам, калькуляцыяй і г. д.

Вялікі карыфей навукі, геніяльны зодчы комунізма таварыш Сталін велізарную ўвагу аддае высвятленню заканамернасці пераходу ад першай фазы комунізма да другой яго фазы. Гаворачы аб навуковым вызначэнні комунізма, таварыш Сталін указвае, што ленінская формула: «Комунізм ёсць Совецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны» з'яўляецца адзіна правільнай.

Новым выдатным укладам у тэорыю навуковага комунізма з'яўляецца абгрунтаванне таварышам Сталіным умоў паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма.

Для таго, каб падрыхтаваць, указвае таварыш Сталін, сапраўдны, а не дэкларатыўны пераход да комунізма, трэба ажыццявіць тры асноўныя папярэднія ўмовы.

Неабходна, па-першае, трывала забяспечыць няспынны рост усёй грамадскай вытворчасці з пераважным ростам вытворчасці сродкаў вытворчасці, без чаго немагчыма ажыццявіць расшыранае ўзнаўленне.

Неабходна, па-другое, шляхам паступовых пераходаў, якія ажыццяўляюцца з выгадай для калгасаў і, значыць, для ўсяго грамадства, узняць калгасную ўласнасць да ўзроўню агульнанароднай уласнасці, а таварнае абарачэнне таксама шляхам паступовых пераходаў замяніць сістэмай прадуктаабмену.

Неабходна, па-трэцяе, дабіцца такога культурнага росту грамадства, які-б забяспечыў усім членам грамадства ўсебаковае развіццё іх фізічных і разумовых здольнасцей, каб члены грамадства мелі магчымасць атрымаць адукацыю, дастатковую для таго, каб стаць актыўнымі дзеячамі грамадскага развіцця, каб яны мелі магчымасць свабодна выбіраць прафесію, а не быць прыкаванымі на ўсё жыццё, у сілу існуючага падзелу працы, да адной якой-небудзь прафесіі.

Толькі пасля выканання ўсіх гэтых папярэдніх умоў, узятых разам, будзе ажыццёўлены карэнны пераход ад адной эканомікі, ад эканомікі соцыялізма, — да другой, вышэйшай эканомікі, да эканомікі комунізма.

У сваёй працы «Эканамічныя праблемы соцыялізма ў СССР» таварыш Сталін даў таксама глыбокі марксісцкі аналіз важнейшых праблем сучаснага капіталізма.

Таварыш Сталін вучыць, што галоўнымі рысамі і патрабаваннямі асноўнага эканамічнага закона сучаснага капіталізма з'яўляюцца «забяспечанне максімальнага капіталістычнага прыбытку шляхам эксплуатацыі, разарэння і збяднення большасці насельніцтва данай краіны, шляхам закабалення і сістэматычнага аграбления народаў другіх краін, асабліва адсталых краін, нарэшце, шляхам войнаў і мілітарызацыі народнай гаспадаркі, якія выкарыстоўваюцца для забяспечання найвышэйшых прыбыткаў».

Таварыш Сталін паказаў абвастрэнне агульнага крызіса капіталізма на сучасным этапе, падкрэсліўшы, што найбольш важным эканамічным вынікам другой сусветнай вайны і яе гаспадарчых вынікаў трэба лічыць распад адзінага, усеахапляючага сусветнага рынка. Гэта вызначыла далейшае паглыбленне агульнага крызіса сусветнай капіталістычнай сістэмы.

Утварэнне адзінага магутнага соцыялістычнага лагера, які супрацьстаіць лагеру капіталізма, прывяло да таго, што адзіны, усеахапляючы сусветны рынак распаўся, утварыліся два паралельныя сусветныя рынкі, якія таксама супрацьстаяць адзін другому. Пры гэтым ЗША і Англія з Францыяй сваёй палітыкай эканамічнай блакады СССР, Кітая і еўрапейскіх народна-дэмакратычных краін, паміма сваёй волі, садзейнічалі ўтварэнню і ўмацаванню новага паралельнага сусветнага рынка. Краіны лагера соцыялізма эканамічна самкнуліся і наладзілі эканамічнае супрацоўніцтва і ўзаемадапамогу. Утварэнне магутнага соцыялістычнага лагера азначае, што ў выніку гэтага сфера прыкладання сіл галоўных капіталістычных краін да сусветных рэсурсаў будзе не пашырацца, а скарачацца, умовы сусветнага рынка збыту для гэтых краін будуць пагаршацца, а недагрузка прадпрыемстваў у гэтых краінах будзе павялічвацца. Усё гэта азначае, што цыклічны характар развіцця капіталізма хоць і захоўваецца, але рост вытворчасці ў галоўных капіталістычных краінах будзе адбывацца на звужанай базе, бо аб'ём вытворчасці ў гэтых краінах будзе скарачацца.

Сусветная сістэма капіталізма, адзначае таварыш Сталін, перажывае ўсебаковы крызіс, які ахоплівае як эканоміку, так і палітыку. У аснове яго ляжыць разлажэнне сусветнай эканамічнай сістэмы капіталізма, якое ўсё больш узмацняецца, і растучая магутнасць адпаўшых ад капіталізма краін—СССР, Кітая і другіх народна-дэмакратычных дзяржаў. Аслабленне капіталізма яшчэ больш паглыбляе яго ўнутраныя супярэчнасці, абвастрае барацьбу паміж імперыялістычнымі драпежнікамі.

Таварыш Сталін вучыць, што ўзбраенне нашых кадраў веданнем законаў эканамічнага развіцця грамадства з'яўляецца адной з важнейшых задач партыі. У сувязі з гэтым велізарнае значэнне набывае стварэнне марксісцкага падручніка палітычнай эканоміі.

«Падручнік патрэбны, — піша таварыш Сталін, — не толькі для нашай совецкай моладзі. Ён асабліва патрэбны для комуністаў усіх краін і для людзей, якія спачуваюць комуністам. Нашы зарубежныя таварышы хочуць ведаць, якім чынам мы вырваліся з капіталістычнай няволі, якім чынам пераўтварылі мы эканоміку краіны ў духу соцыялізма, як мы дабіліся дружбы з сялянствам, як мы дабіліся таго, што наша нядаўна яшчэ жабрацкая і слабая краіна ператварылася ў краіну багатую, магутную, што з сябе прадстаўляюць калгасы, чаму мы, нягледзячы на абагульненне сродкаў вытворчасці, не знішчаем таварнай вытворчасці, грошай, гандлю і г. д. Яны хочуць ведаць усё гэта і многае другое не для простай цікаўнасці, а для таго, каб вучыцца ў нас і скарыстаць наш вопыт для сваёй краіны. Таму з'яўленне добрага марксісцкага падручніка палітычнай эканоміі мае не толькі ўнутрыпалітычнае, але і вялікае міжнароднае значэнне».

Праца таварыша Сталіна «Эканамічныя праблемы соцыялізма ў СССР» прадстаўляе сабою вышэйшы этап у развіцці марксісцка-ленінскай палітычнай эканоміі. Выхад у свет гэтага твора з'яўляецца буйнейшай падзеяй у ідэйным жыцці партыі і совецкага народа. Ён мае сапраўды гістарычнае значэнне. Сталінскі твор зробіць велізарны ўплыў на развіццё перадавой совецкай навукі, дапаможа нашым кадрам глыбей пазнаць законы грамадскага развіцця, адыграе вялікую ролю ў ідэйным узбраенні зарубежных комуністычных і рабочых партый.

Ажыццяўляючы геніяльныя прадначартанні таварыша Сталіна, наша партыя вядзе совецкі народ уперад, да перамогі комунізма.

(Перадавы «Правды» ад 3 кастрычніка).

Кастусь КІРЭЕНКА

Роднай партыі

Я згадаю паходы, суровыя ўспомню гады.
Хоць гарэла зямля,
а нам сніліся ў кветках сады.

Каля Волгі і Дона грымелі агні кананад,
А мы верылі ў шчасце,
нам новы ўставаў Сталінград.

Зноў і зноў маё сэрца
сяброўская мужнасць кране.
Помніш словы, таварыш: «Комуністам лічыце мяне!»

Помніш, як перад боем,
у грозную хвілю жыцця
Вымаўляў іх баец,
перамогі ўздымаючы сцяг.

Вымаўляў і ўставаў
на апошні рашаючы бой
І хоць падаў,
а бачыў бяссмерця святло над сабой.

Маці родная, Партыя!
Колькі шляхоў на зямлі —
Па ніводнаму з іх без цябе мы прайсці не маглі.

І чым большы палаў у змаганні над краем пажар,
Чым цяжэйшы для сэрцаў
быў крыўды і смутку цяжар,

Чым люцейшы быў вораг, —
тым болей у сэрцах сваіх
Адчувалі мы любасць да мудрых рашэнняў тваіх,

Тым бліжэй, тым радней
ты нам, шчырая маці, была,
Тым нам болей патрэбна тваёй было веры — святла.

У суровых баях, як прысягу жыццю і вясне,
Вымаўлялі мы словы: «Комуністам лічыце мяне!».

— Комуністам лічыце! — і ў вогненны крочылі шлях.
І ўставалі ўсе людзі пад ленінска-сталінскі сцяг.

Адгрымела вайна. Мы забудзем вас, бітваў сляды.
Над краінаю мірнай цвітуць Перамогі сады.

Каля Волгі і Дона дарог франтавых не пазнаць.
Каля Волгі і Дона шырокія моры шумяць.

Над усёю Радзімай —
куды ні пайдзі, ні зірні
Для ўсяго чалавецтва гараць комунізма агні.

І ляціць ужо слава аб новых героях тваіх,
Аб сынах тваіх, партыя, мужных, заўжды баявых,

І па цэламу свету, на ўсю неаглядную шыр,
Дзе ідзе барацьба за свабоду, за шчасце і мір.

Дзе ўздымаецца голас: «Не быць, не ўшчынацца вайне»—
Словы праўды гучаць: «Комуністам лічыце мяне!»

— Комуністам лічыце! — уся вымаўляе зямля.
І гартуюцца сэрцы бацькоўскім паглядам з Крэмля.

— Комуністам лічыце! — і гэта для мужных усіх
Падымаецца сонца ў ззянні сцягоў агнявых;

Гэта — марш перамогі, што ў звонкую выльецца медзь,
Гэта — песня юнацтва, якой у жыцці не старэць,

Гэта — слава народаў і шчасце і мір на вякі,
Гэта — новых узлётаў і перамог маякі!

Народныя таленты

Развіццё мастацкай самадзейнасці — адно з яскравых сведчанняў культурнага росту рабочых і калгаснікаў нашай краіны. У рэспубліцы налічваецца 9.425 калектываў мастацкай самадзейнасці, якія ахапляюць звыш 118 тысяч удзельнікаў.

Мастацкая самадзейнасць выхавала многа таленавітых выканаўцаў разнастайных жанраў, вылучыла здольных кіраўнікоў харавых, танцавальных і інструментальных калектываў. Далёка за межамі Беларусі вядомы імёны Т. Лапацінай і А. Рыбальчанкі, удастоеных ганаровага звання заслужаных дзеячоў мастацтва БССР.

Шырокае распаўсюджанне не толькі сярод удзельнікаў самадзейнасці, але і насельніцтва нашых сёл і гарадоў маюць лепшыя песні беларускіх самадзейных кампазітараў П. Шыдлоўскага, Р. Галавасцікава, П. Шэўко, І. Мацціна, Н. Ларкова і іншых. Вялікіх поспехаў дасягнула творчасць самадзейных мастакоў і майстроў прыкладнога мастацтва. Плённа працуюць у гэтай галіне жывапісцы Сокал-Куцілоўскі (Баранавічы), Гвоздзікаў (Віцебск), гродзенскія ткачыхі сёстры Лелюковіч, скульптары Ягадзіцкі (Баранавічы) і Жыўёў (Маладзечна), рэзчыкі па дрэву А. Шахновіч (Пінск) і Мацюк (Дзятлава), інкрустатары Гебелеў і Лаўрыновіч (Мінск) і многія другія.

Драматычныя гурткі аршанскага чыгуначнага клуба, мінскага аўтамабільнага завода, Багушэўскага і Слонімскага раённых Дамоў культуры з поспехам паставілі многаактавыя п'есы совецкіх драматургаў.

Яркім паказчыкам развіцця народных талентаў з'яўляецца дзейнасць шматлікіх харавых, танцавальных, інструментальных калектываў і асобных выканаўцаў, якія часта дасягаюць высокага прафесійнага ўзроўню. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца Азершчынскі, Тураўскі, Запольскі, Любчанскі, Ганцэвіцкі калгасныя хоры, Гомельскі і Слонімскі танцавальныя калектывы.

Мастацкая самадзейнасць з'яўляецца невычарпальнай крыніцай для папаўнення кадраў прафесійнага мастацтва. Лепшыя яе прадстаўнікі штогод прыходзяць у кансерваторыю, тэатральны інстытут і мастацкае вучылішча. Самадзейныя мастакі І. Рудчык, М. Аўчыннікаў, І. Шыкін (Брэст) прыняты ў члены Саюза совецкіх мастакоў БССР. У кансерваторыі вучыцца здольны спявак А. Самарадаў — былы ўдзельнік самадзейнасці Шаркоўшчынскага раённага Дома культуры Полацкай вобласці, талечавітыя самадзейныя кампазітары М. Шумілін і Ю. Семяняка. З лепшых удзельнікаў творчых калектываў укамплектаваны Беларускі дзяржаўны народны хор.

XIX з'езд ВКП(б) раскрывае новыя шляхі для росквіту народнай творчасці і прафесійнага мастацтва, якое натхняе мільёны людзей на барацьбу за мір, на новыя выдатныя працоўныя подзвігі.

Г. ЦІТОВІЧ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

Вышла ў свет праца І. В. Сталіна „Эканамічныя праблемы соцыялізма ў СССР"

Дзяржаўнае выдавецтва палітычнай літаратуры выпусціла ў свет асобнай брашурай працу І. В. Сталіна «Эканамічныя праблемы соцыялізма ў СССР».

Брашура змяшчае:

Заўвагі па эканамічных пытаннях, звязаных з лістападаўскай дыскусіяй 1951 года.

Адказ таварышу Ноткіну Аляксандру Ільічу.

Аб памылках т. Ярашэнкі Л. Д.

Адказ таварышам Санінай А. В. і Венжэру В. Г.

Брашура выдаецца тыражом 1.500 тысяч экземпляраў.

(ТАСС).

Выстаўка, прысвечаная перамогам совецкага народа

У чытальнай зале ўрадавай бібліятэкі імя А. М. Горкага адкрыта выстаўка — «СССР паміж XVIII і XIX з'ездамі ВКП(б)».

Выстаўка пачынаецца раздзелам «І. В. Сталін — арганізатар і натхніцель нашых перамог». У гэтым раздзеле — творы таварыша Сталіна, тэксты яго гутарак з карэспандэнтамі «Правды», гістарычныя дакументы, фотаілюстрацыі.

У дыяграмах, кнігах, фотаздымках, брашурах расказваецца аб дасягненнях совецкага народа за перыяд паміж двума з'ездамі ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, таваразвароту, транспарта, сувязі, матэрыяльнага добрабыту, аховы здароўя працоўных і культуры нашай краіны.

У гэтай-жа зале адкрыта літаратурная выстаўка—«БССР да XIX з'езда ВКП(б)». На вітрынах — справаздачны даклад сакратара ЦК КП(б)Б Н. С. Патолічава на XX з'ездзе КП(б)Б, а таксама іншыя матэрыялы з'езда, мастацкія творы лаўрэатаў Сталінскіх прэмій Я. Коласа, А. Куляшова, П. Броўкі, М. Танка, К. Крапівы, І. Шамякіна, Я. Брыля. Тут-жа выстаўлена серыя брашур, у якой стаханаўцы рэспублікі расказваюць аб сваім наватарскім вопыце ў працы.

Агні новай калгаснай гідраэлектрастанцыі

«Комунізм ёсць Совецкая ўлада плюс электрыфікацыя ўсёй краіны». Гэтыя ленінскія словы ўсё паўней і паўней увасабляюцца ў рэальныя справы ў нашай краіне не толькі ў буйных гарадах, але і ў сельскай мясцовасці, у вёсках, якія яшчэ нядаўна былі глухімі куткамі.

Напярэдадні XIX з'езда ВКП(б) у адным з нядаўніх глухіх куткоў Беларусі, на беразе рэчкі Тураўлянкі ў Гомельскім сельсавеце Ветрынскага раёна Полацкай вобласці, ярка ўспыхнулі агні калгаснай гідраэлектрастанцыі. Агульная яе магутнасць 330 кілават. Гомельская ГЭС злучае цэлую сістэму азёр і ўтварае водасховішча плошчай больш 2 тысяч гектараў. Гідраэлектрастанцыя пабудавана сіламі калгаснікаў.

У гэтым годзе будзе закончана электрыфікацыя трох калгасаў Гомельскага сельсавета. Акрамя асвятлення кватэр у калгасах «Чырвоны партызан» і «Перамога», устаноўлены электраматоры, якія будуць прыводзіць у рух малатарні, сартыроўкі, сячкарні. Гідрастанцыя дасць ток калгасам Ветрынскага і Ушацкага раёнаў.

Кінафестывалі мастацкіх фільмаў

У Гомелі праходзяць кінафестывалі, прысвечаныя XIX з'езду ВКП(б). У кінатэатры імя Калініна фестываль пачаўся дэманстрацыяй фільмаў «Кавалер Залатой Звязды», «Незабыўны 1919 год», «Клятва», «Партыйны білет».

Праводзіцца кінафестываль таксама ў Палацы культуры чыгуначнікаў імя Леніна. Кінафестывалі карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў гледачоў.

Людзі яснай перспектывы і вялікай мэты

★

Д. ПАЛІТЫКА

★

Усіх пісьменнікаў многанацыянальнай совецкай літаратуры найбольш хвалюе тэма новага чалавека — станоўчага героя нашага часу, актыўнага і самаадданага барацьбіта за комунізм, носьбіта высокіх прынцыпаў комуністычнай маралі.

Не злічыць слаўных спраў, слаўных подзвігаў совецкіх людзей у імя комунізма і слаўных імён герояў усенароднай барацьбы і працы. Іх мільёны. Іх ведае і паважае народ. На іх вопыце вучацца і выхоўваюцца тысячы людзей. Яны — сапраўдныя героі нашага жыцця. Іх энергіяй і працай будуюцца фабрыкі і заводы, пракладваюцца чыгункі і каналы, узводзяцца сонечныя гмахі комунізма. Іх праноўныя будні, жыццё і быт, радасці і няўдачы даўно сталі тэмамі совецкай літаратуры.

Станоўчага героя нашага часу літаратура бачыць перш за ўсё ў комуністах, якія арганізоўваюць, выхоўваюць і вядуць за сабой нашых людзей. І гэта зразумела: народ любіць партыю, верыць ёй, справу партыі лічыць сваёй справай — у радах партыі ён бачыць лепшых сваіх людзей.

Правільнае і яснае разуменне шматграннай і шматбаковай дзейнасці комуністычнай партыі ў масах, яе арганізуючай, кіруючай і накіроўваючай сілы дапамагае пісьменнікам глыбока асэнсаваць і мастацка адлюстраваць у літаратуры поспехі і дасягненні социялістычнага будаўніцтва, жыццё і барацьбу совецкага народа за комунізм. Незабыўнымі мастацкімі творамі нашай літаратуры сталі тыя, у якіх створаны жывыя, яркія і праўдзівыя вобразы комуністаў, людзей, выхаваных партыяй і адданых народу.

Паказу арганічнай сувязі партыі, комуністаў з шырокімі масамі працоўных прысвечана многа яркіх твораў сучаснай беларускай прозы. Цяжка назваць хоць-бы адзін значны твор нашай паслявоеннай прозы, у якім непасрэдна або ўскосна не закраналася-б тэма партыі.

Гэтая тэма з'яўляецца агульнай, скразной тэмай нашай прозы: ці прысвечаны творы героіцы ўсенароднай партызанскай барацьбы і вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ці прысвечаны яны пытанням аднаўлення і далейшага развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі рэспублікі. Сказанае аднолькава адносіцца як да вялікіх эпічных палотнаў, так і да малых жанраў прозы — навелы, нарыса, апавядання.

Героіка і будні ўсенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі супраць фашысцкіх акупантаў яшчэ доўга будуць крыніцай паэтычнага натхнення, крыніцай тэм, матываў і сюжэтаў новых твораў совецкіх літаратараў. Гэтай тэме прысвечаны кнігі «Людзі асобага складу» В. Казлова і «Партызанскі край» Ь. Лівенцава, напісаныя комуністамі, арганізатарамі, удзельнікамі тых падзей, аб якіх расказана ў кнігах, у супрацоўніцтве з пісьменнікамі А. Кулакоўскім і Р. Няхаем.

Героі Совецкага Саюза былы сакратар Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б В. Казлоў і былы камандзір першай бабруйскай партызанскай брыгады В. Лівенцаў з дакументальнай дакладнасцю расказваюць у сваіх кнігах аб велізарным размаху партызанскага руху ў Беларусі ў дні Вялікай Айчыннай вайны, даюць шырокую карціну тої велізарнай работы, якую праводзіў Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі Беларусі па арганізацыі гэтага руху на тэрыторыі ўсёй рэспублікі, расказваюць аб перадавой ролі комуністаў і комсамольцаў ва ўсенароднай барацьбе.

Калі сёння мы гаворым аб сучаснай беларускай прозе, дык мы маем на ўвазе перш за ўсё раман-эпапею М. Лынькова «Векапомныя дні» (І ч.) і раман І. Шамякіна «Глыбокая плынь» — два буйныя творы беларускай прозы, прысвечаныя ўсенароднай партызанскай барацьбе ў Беларусі.

Раманы М. Лынькова і І. Шамякіна ставяць у цэнтры ўвагі праблему партыйнага кіраўніцтва партызанскай барацьбой беларускага народа. Пісьменнікі разглядаюць усенародную партызанскую вайну, як вынік велізарнай арганізатарскай, палітычнай і масавай работы партыі з народам не толькі ў перыяд вайны, але, талоўным чынам, у гады мірнага социялістычнага будаўніцтва.

Творчыя поспехі М. Лынькова і І. Шамякіна тлумачацца тым, што яны падыйшлі да вырашэння складанай тэмы з правільных пазіцый — з пазіцый социялістычнага рэалізма. Яны сканцэнтравалі ўвагу на тым свядомым пачатку, які ўнесла ў партызанскую барацьбу Комуністычная партыя, большэвікі.

Сакратар падпольнага райкома партыі Павел Сцяпанавіч Лясніцкі («Глыбокая плынь») і сакратар падпольнага абкома партыі Васіль Іванавіч Шаршань («Векапомныя дні») увасабляюць ідэю непарыўнай сувязі партыі з народам. Партыя ўняла іх, былых пастухоў і батракоў, да ўзроўню партыйных дзеячоў, народных абаронцаў, выразнікаў лепшых спадяванняў народа, і яны здолелі падняць і арганізаваць народ на барацьбу, як арганізоўвалі і вялі яго на выкананне планаў социялістычнага будаўніцтва. Яны дзейнічалі ад імя партыі, якой народ бязмежна давярае, і ў гэтым была іх сіла.

Звяртаючыся да народа, Шаршань гаворыць: «Браты мае! Я вельмі рад, што зноў сярод вас, што перадаю вам сталінскае слова! Партыя пасылала мяне і раней да вас... І мне здаецца, не дрэнна мы папрацавалі разам з вамі. Я памятаю кожнае бярвенца, якое паклядзена вамі за тыя гады. Я памятаю, як асушылі мы балота пад лесам. Як сеялі ўпершыню ішаніцу, як пасылалі вашых дэлегатаў у Маскву на выстаўку. Не з кепскага жыцця пасылалі. А колькі дзяўчат ды хлопцаў пасылалі на вучобу!

... Вось і цяпер партыя паслала мяне да вас, каб сказаць, што не загінем мы, што фашыстаў мы паб'ем, вытурым іх з нашай зямлі. І духу іх у нас не застанецца. Партыя прыслала мяне сказаць вам, што яна заўсёды з вамі, што яна думае аб вас, што яна клапоціцца, каб вызваліць вас ад гэтых нахабнікаў».

Народ ведае Лясніцкага і Шаршня не па іх абяцаннях і дэкларацыях, а па іх справах. Людзі гасцінна і радасна сустракаюць іх, як сустракае чалавек надзею на сваё вызваленне, на зварот да ранейшага шчаслівага жыцця. Народ згуртоўваецца вакол іх, вакол падпольных партыйных арганізацый, кіруемых імі.

Творчыя поспехі М. Лынькова і І. Шамякіна заключаюцца ў тым, што пісьменнікі добра ведаюць жыццё, аб якім пішуць у сваіх творах, і ўмеюць бачыць і ўзяць з гэтага жыцця не другараднае і выпадковае, а тое, што ляжыць у аснове нашага жыцця. Пісьменнікі здолелі паказаць на яркіх прыкладах, мастацкіх вобразах і дэталях рухаючыя сілы совецкага грамадства, — патрыятызм совецкіх людзей, дружбу народаў, глыбокі інтэрнацыяналізм, уменне нашых дзеячоў крытычна і самакрытычна глядзець на свае няўдачы.

Комуністы з'яўляюцца людзьмі яснай перспектывы і вялікай мэты.

М. І. Калінін у прамове на выпуску студэнтаў Свердлоўскага універсітэта ў 1926 годзе гаварыў, што ў партыйнага работніка самае каштоўнае тое, што ён у любой будзённай абстаноўцы ўмее святочна працаваць, перамагаць перашкоды, якія ставіць жыццё, умее бачыць канчатковую мэту, за якую змагаецца, — комунізм.

М. Лынькоў і І. Шамякін паказваюць, што народ разглядае партызанскую барацьбу, як неабходную ўмову, каб хутчэй вярнуцца да мірнай стваральнай працы, да таго шчаслівага жыцця, якое перапынілі рабаўнікі-захопнікі. І гэтыя пачуцці і гэтую мэту выхоўваюць у народзе комуністы, аб гэтым гаворыць з народам Шаршань, гэта дазодзіць Маеўскаму Лясніцкі.

У творах, прысвечаных мірнай стваральнай працы беларускага народа па аднаўленню і далейшаму развіццю народнай гаспадаркі, комуністы выступаюць ініцыятарамі, арганізатарамі і натхніцелямі працоўных подзвігаў народа, выхавацелямі мас у духу комунізма.

Наша літаратура адлюстравала складаны працэс адраджэння і далейшага развіцця сельскай гаспадаркі, прамысловасці і культуры рэспублікі, як працэс брацкага супрацоўніцтва і дапамогі беларускаму народу ўсіх народаў Совецкага Саюза. Пісьменнікі праўдзіва паказалі, што ідэя брацтва народаў у барацьбе за комунізм выхоўваецца ў народзе комуністамі. Яны падаюць прыклады гэтага супрацоўніцтва. У гэтым і заключаецца адна з умоў таго, што рэспубліка ў кароткі час узнялася з руін яшчэ больш прыгожай і магутнай, чым яна была да вайны. А. Кулакоўскі і М. Паслядовіч у сваіх творах «Гартаванне» і «Цёплае дыханне» аб будаўніцтве гігантаў паслявоеннай прамысловасці Беларусі — Мінскага трактарнага і аўтамабільнага заводаў, — паказалі, што поспех хуткага ўвядзення ў строй гэтых гігантаў першай паслявоеннай пяцігодкі залежаў не толькі ад працоўнага энтузіязма беларускіх будаўнікоў, але і ад таго, што яны атрымалі дапамогу ад вялікага рускага і брацкага украінскага народаў. У карціне прабывання беларускіх трактарабудаўнікоў у Сталінградзе А. Кулакоўскі паказвае, што Сталінград навечна замацаваў дружбу народаў, выхаваў тысячы адданых справе комунізма людзей і зрабіў іх комуністамі. Такім з'яўляецца ў аповесці комуніст Янук Дукора. Сталінград выступае, як сімвал братэрства, узаемадапамогі і непераможнасці совецкага народа.

Праўда, А. Кулакоўскі і М. Паслядовіч не здолелі стварыць яркіх вобразаў комуністаў, атмасферы партыйнага жыцця будаўнічых калектываў таму, што звузілі свае тэмы, звёўшы іх да пытання росту і перавыхавання моладзі ў працэсе стваральнай працы. Але і ў гэтых творах, асабліва ў «Цёплым дыханні», мы бачым авангардную ролю комуністаў.

У навелах, нарысах і апавяданнях І. Грамовіча, П. Кавалёва, у творах Я. Брыля, І. Шамякіна, М. Паслядовіча, А. Стаховіча паказана барацьба комуністаў за аднаўленне сельскай гаспадаркі рэспублікі, разбуранай і абрабаванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У аповесці «Да ясных вышыняў» Іван Грамовіч узняў важную тэму супрацоўніцтва прамысловых прадпрыемстваў рэспублікі з калгасамі, дапамогі партыйных і комсамольскіх арганізацый, прадпрыемстваў калгасам у арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні іх. І. Грамовічу асабліва ўдаліся вобразы моладзі, выхаванай комуністамі, комсамольцаў Фёдара Салаўянчыка і Любы Ганарацкай. У атмасферу высокаідэйнага партыйнага жыцця ўводзяць нас апавяданні П. Кавалёва са зборніка «У новы дзень». У апавяданнях «У новы дзень», «Сакратар выклікае» і іншых П. Кавалёў паказаў, што партыйныя арганізацыі сельскіх раёнаў выключную ўвагу аддаюць палітычнаму выхаванню народа, умеюць тактычна і мэтанакіравана выхоўваць у комуністаў і ў народа пачуццё дзяржаўнай адказнасці, узнімаць комуністычную свядомасць мас.

Комуніст Міркіян Малазёмаў («Пад мірным небам» А. Стаховіча) вярнуўся з фронта ў родны калгас, разбураны акупантамі. Малазёмаў уступіў у партыю ў цяжкія дні абароны Масквы, прайшоў суровую школу фронта і, вярнуўшыся да мірнай працы, пачаў ствараць пярвічную калгасную партыйную арганізацыю. Яму дапамагае райком, і хутка маленькая партыйная арганізацыя мабілізуе калгаснікаў на выкананне перспектыўнага плана аднаўлення і далейшага развіцця арцелі.

У вобразе Міркіяна Малазёмава праўдзіва ўвасоблены рысы радавога комуніста-калгасніка, які палітычна вырас за гады Айчыннай вайны.

Цікавым вобразам фрачтавіка — сельскага комуніста з'яўляецца Васіль Сурмак, герой аповесці Янкі Брыля «У Забалоцці днее». У лёсе комуніста Васіля Сурмака адлюстроўваецца цяжкі шлях сялян былой Заходняй Беларусі да шчаслівага калгаснага жыцця. Пісьменнік пераканальна паказаў, што Васіль Сурмак не толькі стойкі барацьбіт за калектывізацыю, за социялістычны лад жыцця ў Забалоцці, але і просты, сардэчны чалавек.

Аднак трэба ўказаць на мастацкую недасканаласць вобразаў комуністаў у радзе твораў нашай прозы, на беднасць і схематызм у іх абмалёўцы. Жыццё, сама рэчаіснасць значна яркейшыя і больш маляўнічыя, чым здлюстроўвае літаратура. Беларуская проза не стварыла яшчэ яркага, тыповага вобраза нашага сучаснікакомуніста, глыбока не раскрыла яго палітычнага аблічча, яго высокіх маральных якасцей. Вобразы комуністаў — парторга Рабініна, інжынера Хадароўскага і начальніка будаўніцтва Кораба («Цёплае дыханне» М. Паслядовіча), Янука Дукоры — майстра-брыгадзіра трактарнага завода («Гартаванне» А. Кулакоўскага), Антона Янушкевіча — сакратара райкома партыі («Вяснянка» Т. Хадкевіча) і другіх правільна намечаны пісьменнікамі, як вобразы носьбітаў новага, перадавога, барацьбітоў за перамогу ідэй партыі, але пададзены яны пункцірна, апісальна, мала выразна.

Вобраз парторга Рабініна ў аповесці «Цёплае дыханне» М. Паслядовіча значна ўступае другарадным вобразам аповесці, скажам, вобразу Навіцкага. Пра Янука Дукору А. Кулакоўскі толькі ўпамянуў, што ён комуніст. Недахоп у абмалёўцы большасці з названых вобразаў заключаецца ў тым, што комуністы тут падаюцца як адзіночкі, якія растварыліся ў масе, а не як члены партыйнай арганізацыі; яны адарваны ад партарганізацыі, стаяць па-за партыйным жыццём. Чым адрозніваецца інжынер Хадароўскі ад парторга Рабініна? Бадай, гаспадарнік-комуніст Хадароўскі бліжэй стаіць да масы, чым парторг Рабінін. Такі-ж недахоп мы бачым, на жаль, і ў творах, дзе вобразы комуністаў пададзены яркай і больш жыццёва. Пры ўсёй перакавальнасці і жыццёвасці вобраза Лясніцкага («Глыбокая плынь» І. Шамякіна), у ім многа схематычнага. Мы не бачым у рамане моцнай партыйнай арганізацыі, не бачым таго падпольнага райкома, сакратаром якога з'яўляецца Лясніцкі.

Недахопам у стварэнні вобразаў комуністаў з'яўляецца і тое, што яны звычайна малююцца аднапланава: у іх дачыненні да непасрэдных службовых абавязкаў.

Найбольш яскравыя вобразы комуністаў створаны ў рамане-эпапеі «Векапомныя дні». Але і нават самаму запаміналь-наму вобразу сакратара падпольнага абкома Васілю Іванавічу Шаршню нестае паказу ўсёй складанасці яго ўнутранага свету. М. Лынькоў дастаткова ярка раскрыў яго адданасць партыі і народу, яго арганізатарскія здольнасці, яго веру ў перамогу, але ў пісьменніка для вобраза Шаршня не знайшлося тых мастацкіх дэталяў, фактаў, якія ён знайшоў для абмалёўкі, скажам, старога лесніка.

Наша проза, як і ўся літаратура, яшчэ ў вялікім даўгу перад партыяй і народам. Абавязак пісьменнікаў, нашай совецкай літаратуры — напісаць такія творы, дзе-б жыццё і барацьба партыі за комунізм, «якая спалучае самую суровую цвярозую работу з найвялікшай героікай і грандыёзнымі перспектывамі» (А. Жданаў), знайшлі жывое і яркае адлюстраванне.

Вобразы геніяў рэволюцыі

★

Д. АРЛОЎ,

народны артыст БССР

★

1917 год. Трэцяе красавіка. Піцерскія пролетарыі, даведаўшыся аб тым, што Ленін вяртаецца з эміграцыі, збіраюцца на плошчы Фінляндскага вакзала. Часоваму ўраду, нягледзячы на прынятыя меры, не ўдаецца перашкодзіць сустрачы народа са сваім любімым правадыром. Гэтая сустрэча вылілася ў хвалюючую дэманстрацыю любві і адданасці рабочых і салдат вялікаму правадыру рэволюцыі. Сваю гістарычную прамову з браневіка Владзімір Ільіч Ленін заканчвае пад воклічы народа заклікам: «Няхай жыве социялістычная рэволюцыя!»...

Так пачынаецца спектакль «Кастрычнік» на сцэне Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы.

На сцэне старэйшага тэатра рэспублікі ўпершыню з магутнай сілай увасоблены вобразы стваральнікаў Комуністычнай партыі, правадыроў народа В. І. Леніна і І. В. Сталіна. Нягледзячы на хранікальнасць п'есы (аўтары М. Бальшынцоў і М. Чыаурэлі), пастаноўшчыку спектакля І. Я. Судакову ўдалося дамагчыся арганічнага адзінства і драматычнай напружанасці дзеі, злітнасці ідэйнага зместу і мастацкай формы. Крок за крокам, ад эпізода да эпізода ў спектаклі сцвярджаецца тэма большэвіцкага кіраўніцтва, адзінства правадыроў і народа, адзінства правадыроў і партыі.

Спектакль паказальны яшчэ і ў тым сэнсе, што ў ім няма таго стылявога і выканаўчага разнабою, які быў уласцівы некаторым ранейшым пастаноўкам тэатра. Тут прыкметна цвёрдая накіроўваючая рэжысёрская рука і выразнасць рэжысёрскай задумы.

Вобраз генія рэволюцыі В. І. Леніна — вялікае творчае дасягненне П. Малчанава. Артыст натхнёна перадае непахісную рэволюцыйную страснасць вялікага Леніна, яго магутны аптымізм і ідэйную мэтаімкнёнасць, чалавечую прастату. П. Малчанаў сканцэнтраваў сваю ўвагу на паказе тых характарных рыс Леніна, якія былі падрабязна раскрыты І. В Сталіным: Ленін, пісаў таварыш Сталін, — «... кіраўнік вышэйшага тыпу, горны арол, які не ведае страху ў барацьбе і смела вядзе ўперад партыю па нявіведаных шляхах рускага рэволюцыйнага руху». Ленін «быў народжаны для рэволюцыі». Ленін — вялікі чалавек, які ўвасобіў у сабе лепшыя рысы мас, карыстаўся выключнай любоўю і давер'ем народа. Гаворачы аб велічы Леніна, як дзяржаўнага дзеяча, аб яго ўменні зазіраць далёка ўперад, І. В. Сталін пісаў: «У дні рэволюцыйных паваротаў ён літаральна расцвітаў, станавіўся яснавідцам, прадугадваў рух класаў і магчымыя зігзагі рэволюцыі...».

Творча засвойваючы думкі І. В. Сталіна аб Леніне, Малчанаў па-майстэрску раскрывае багацце думак і пачуццяў Ільіча.

Высокародная задача — узнавіць на сцэне вобраз Леніна — выпала на долю П. Малчанава яшчэ ў 1939 годзе, калі ён упершыню выканаў ролю Владзіміра Ільіча ў спектаклі «Чалавек з ружжом». У той час у клопатах аб «падабенстве» артыст крыху захапляўся лепкай дэталяў вонкавага вобліка правадыра. Гэта натуральна прыводзіла да некаторай перанапружанасці ў ігры. Але паступова, ад п'есы да п'есы і праз кінафільм «Незабыўны 1919» П. Малчанаў вызваляўся ад гэтай перанапружанасці і ўсё больш пераключаў сваю ўвагу на вырашэнне «ўнутраных» задач. У спектаклі «Кастрычнік» П. Малчанаў вядзе ролю з глыбокім пачуццём.

Найбольш удаліся артысту «трыбунныя сцэны» — на браневіку, на з'ездзе Советаў, фінальная. Прамовы Леніна, звернутыя да народа, напоўнены вялікай палымянасцю і патэтычным уздымам. Тут П. Малчанаў дасягае поўнага гарманічнага зліцця ўнутраных і вонкавых рысаў Владзіміра Ільіча. У раскрыцці другой не менш важнай рысы вобраза — ленінскай прастаты і чалавечнасці — артыст дасягае найбольшага поспеху ў сцэне з Марыяй Васільеўнай Нікалаевай (артыстка Л. Ржэцкая). У гэтым эпізодзе перад гледачом — жывы Ленін, «самы чалавечны чалавек» Цёпла і ўсхвалявана праводзіць Малчанаў сцэну развітання Леніна са Сталіным перад уходам Леніна ў падполле.

Гэта лепшыя сцэны спектакля.

Для далейшага ўдасканалення ролі артысту трэба старацца вызваліцца ад залішняга пластычнага «непакою», які надае вобразу вонкавую мітуслівасць і вядзе часам да непатрэбнага пазіравання.

Велізарная адказнасць кладзецца на актора, якому даручана ўвасобіць на сцэне вобраз І. В. Сталіна.

Жыццё Сталіна, як і Леніна, арганічна звязана з жыццём совецкага народа. «Сталін — гэта Ленін сёння», — пісаў А. Барбюс. Вялікаму Сталіну — «новаму правадыру новых мас» уласцівы ленінскія рысы: прастата і сціпласць, упэўненасць у перамозе, найвялікшая прынцыповасць, вера ў творчыя сілы мас, мудрасць пры вырашэнні складаных пытанняў, самаадданая любоў да народа. Гэта толькі частка тых якасцей, якімі характарызуецца вобраз геніяльнага правадыра, друга і настаўніка совецкага народа.

Працуючы над вобразам Іосіфа Вісарыёнавіча, Б. Платонаў ставіў перад сабой задачу пранікнуць у сутнасць пытанняў палітыкі і стратэгіі правадыра большэвіцкай партыі. Кожны этап біяграфіі І. В. Сталіна — гэта велізарны перыяд у развіцці рэволюцыйнага руху, у гісторыі партыі і Совецкай дзяржавы. Вось чаму артыст уважліва вывучаў біяграфію правадыра, імкнуўся захапіць гледача духоўным жыццём Сталіна, яго светлымі думкамі, верай у сілы народа.

Шчыра, з выключнай цеплынёй перадае Платонаў пачуццё любві і пашаны І. В. Сталіна да Владзіміра Ільіча.

Вобраз генія чалавецтва найбольш змястоўна раскрываецца ў сцэне ў рэдакцыі газеты «Правда». Артыст вельмі проста і непасрэдна паказвае таварыша Сталіна ў рабочай абстаноўцы за выпускам чарговага нумара газеты. Усхвалявана заканчвае Платонаў сцэну развітання з Леніным, які вымушаны ісці на канспіратыўную кватэру.

Прадаўжаючы работу над вобразам таварыша Сталіна, артысту неабходна дамагчыся яшчэ большай унутранай пераканальнасці, маштабнасці вобраза. Няўвага да асобных падзей, залішняя паспешлівасць часам перашкаджаюць Платонаву данесці да гледача веліч думак правадыра.

Пастаноўшчык спектакля настойліва і няўхільна развівае тэму правадыроў і партыі, тэму правадыроў і народа. Тут з выключнай паслядоўнасцю перададзены жывыя сувязі Леніна і Сталіна з народам.

Праз увесь спектакль праходзяць вобразы трох салдат — Багрова (артыст Ул. Дзядзюшка), Серагы (артыст Г. Глебаў) і Цімура (артыст Б. Кудраўцаў). Гэта салдацкія дэпутаты — слугі народа. У іх біяграфіі адлюстравана біяграфія маладой совецкай краіны.

... Штаб рэволюцыі — Смольны. Адсюль Ленін і Сталін кіравалі баямі за ўладу Советаў. Адсюль піцерскі пролетарыят, атрады чырвонагвардзейцаў і матросаў накіроўваліся на разгром контррэволюцыі. Адсюль рэволюцыйнае камандаванне крэйсера «Аўрора» атрымлівае загад: даць сігнал да агульнага штурму Зімняга палаца. Спектакль з гістарычнай дакладнасцю паказвае ролю партыйнага цэнтра на чале з таварышам Сталіным, які кіраваў паўстаннем праз Ваенна-Рэволюцыйны камітэт.

Дваццаць пятае кастрычніка — першы дзень новай эры, кульмінацыйны пункт развіцця рэволюцыйных падзей, якія паказаны ў спектаклі.

Праўдзівае адлюстраванне гістарычных дзён барацьбы за ўладу Советаў, любоў народа да вялікіх правадыроў заканамерна вялі да сапраўднай рэволюцыйнай рамантыкі ў масавых сцэнах. Гэтыя сцэны (Фінляндскі вакзал, у рэдакцыі газеты «Правда», у школе, у Смольным) — праводзяцца з выключным уздымам. У распрацоўцы масавых сцэн, таксама як і ў рабоце над вобразамі, рэжысёр І. Я. Судакоў кіраваўся цудоўнай традыцыяй мастацтва МХАТ'а. У большасці эпізодаў правільна перададзены гістарычныя падзеі і знойдзены адпаведны рытм. Мізансцэны тут скульптурна выразныя.

Для большай гістарычнай праўды, для глыбейшага раскрыцця канфлікта драматургам варта было-б узмацніць паказ барацьбы партыі супраць ворагаў рэволюцыі, супраць трацкістаў і бухарынцаў. У п'есе апартуністы і здраднікі паказаны «загадкавай» фігурай Варанкова (артыст К. Саннікаў). Контррэволюцыйную буржуазію прадстаўляе зусім бледны і статычны персанаж Пётр Ліпатаў (артыст С. Бірыла).

Разам з тым аўтары адводзяць непамерна вялікае месца сям'і клікуш Шатровых з іх паталагічнымі ўчынкамі.

Ніякімі ўнутранымі матывамі не прадыктавана неабходнасць паказа ў такіх вялікіх маштабах «акружэння» гора-прэм'ера Керэнскага. Для таго, каб напомніць, што ўнутраная контррэволюцыя ўтрымлівалася на англа-амерыканскія грошы, зусім не было неабходнасці паказваць «бал» у Зімнім палацы. Сустрэчу паслоў з Керэнскім можна было-б наладзіць у другім, больш сціплым і «ўтульным» месцы. Уся гэта сатырычная «вампука» ў Зімнім палацы здаецца нам не дарэчы.

Нездавальненне выклікае таксама атракцыён са з'яўленнем у рэдакцыі газеты «Правда» футурыстаў. Гэта сцэна вельмі недарэчная і гучыць, як устаўны нумар. Зусім не было патрэбы даваць гэтую сцэну для ўзнаўлення «атмасферы эпохі».

Тэатр павінен звярнуць сур'ёзную ўвагу і на культуру мовы. Артыст В. Скакун, з такой экспрэсіяй іграе ролю матроса, што праглынае ўвесь тэкст — нельга зразумець яго сэнсу. Невыразнае вымаўленне і ў артыста М. Лапідуса, які ў ролі паэта-імажыніста ў прысутнасці таварыша Сталіна чытае свой бязглузды верш. Вельмі багата тэкста прападае і ў артыста С. Хацкевіча («дзядзя Міша»), у якога надзвычай дрэнная дыкцыя.

Артыст В. Сярпкоў у ролі Шатрова размаўляе са сцэны на мове, якая вельмі мала падобна на беларускую. Не ўважліва ставяцца да культуры мовы і некаторыя маладыя артысты.

У далейшым тэатру трэба яшчэ больш індывідуалізаваць асобныя фігуры народных сцэн. І асабліва гэта варта зрабіць у «школьнай» сцэне (Шосты з'езд партыі).

Спектакль «Кастрычнік» — па-сапраўднаму партыйны. Ён вызначаецца высокай культурай рэжысуры і значным акторскім майстэрствам. Гэты спектакль — новы этап у творчым жыцці калектыва тэатра.

Сустрэча кампазітараў з Дзяржаўным хорам

Калектыў Беларускага дзяржаўнага хора нядаўна сустрэўся з кампазітарамі. Пасля выканання песень «Мір адстаім» В. Яфімава, «Партызанскія акопы» Р. Пукста, «У садочку май» Я. Цікоцкага, «Лясная песня» Ул. Алоўнікава, вальса «Прышоў жаданы час» П. Падкавырава і апрацовак народных песень артысты і кіраўнікі хора падзяліліся з кампазітарамі думкамі аб іх творах.

Саліст Юневіч адзначыў, што хор з асаблівай увагай працаваў над «Партызанскімі акопамі» Р. Пукста. Мелодыка гэтай песні цалкам адпавядае добраму тэксту Максіма Танка і напісана з сапраўдным адчуваннем спецыфікі жанра. Са здавальненнем выконвае хор «Лясную песню». Разам з тым прамоўца звярнуў увагу на тое, што ў вальсе П. Падкавырава партыя саліста не звязана з акэмпанементам. А. Багатыроў не зусім удала апрацаваў народную песню аб Заслонаве. Не задавальняе яшчэ песня аб Маскве В. Яфімава.

Артысты хора папракалі кампазітараў за неўважлівасць да тэкстаў, за недастатковае харавое майстэрства. Яны прасілі напісаць песні аб героях новабудоўляў, аб новым Мінску.

Свае думкі аб вакальным майстэрстве хора выказалі кампазітары Р. Пукст, Я. Цікоцкі, М. Аладаў, Д. Лукас, П. Падкавыраў, хормайстар Маслаў, дацэнт кансерваторыі Л. Мухарынская.

Было падкрэслена, што ў сувязі з прыходам у калектыў значнай групы новых спевакоў заўважаецца пагоршанне дыкцыі хора, невыразнасць інтанацыі, а ў некаторых песнях гучаць фальшывыя ноты. Выпраўленне гэтых хібаў патрабуе сур'ёзнай увагі мастацкага кіраўніцтва калектыва.

М. Аладаў заўважыў, што кіраўнікі калектыва не аддаюць належнай увагі гераічнай песні.

Ул. Алоўнікаў расказаў, што ён піша харавую сюіту на тэксты Петруся Броўкі і Максіма Танка. Чатыры песні з гэтай сюіты ўжо гатовы і будуць у бліжэйшы час перададзены дзяржаўнаму хору.

Д. Лукас напісаў для калектыва харавыя творы «У садочку май» і «Рыбацкі хор».

Удзельнікі абмеркавання выказалі сваё незадавальненне тым, што Камітэт па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР не забяспечыў яшчэ хор належным памяшканнем для рэпетыцый, што шкодна адбіваецца на яго творчай рабоце.

Народны артыст БССР Р. Шырма заклікаў кампазітараў настойліва авалодваць жанрам харавой песні, даць калектыву творы, якія яму неабходны для выканання ў час дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве.

Пачатак тэатральнага сезона

Спектаклем «Вей, вецярок» па п'есе Я. Райніса (рэжысёр А. Міронскі) сёння пачынае асенне-зімовы сезон у Брэсце дзяржаўны тэатр імя ЛКСМБ.

Бліжэйшыя новыя пастаноўкі: «Інакш жыць нельга» А. Сафронава, «Дзяўчаты-красуні» А. Сімукова і «Два вяронцы» В. Шэкспіра.

Для пастаяннай работы ў творчы калектыў запрошаны малады рэжысёр І. Багданаў, які скончыў Дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва ў Маскве.

* * *

Пачаўся новы сезон у Пінскім абласным драматычным тэатры.

У калектыў тэатра прышлі маладыя акторы — выхаванцы Беларускага тэатральнага інстытута. Галоўным рэжысёрам заверджаны В. Шутаў. Ён працуе цяпер над пастаноўкай п'есы Арбузава «Таня». Спектакль рыхтуецца да трыццаць пятай гадавіны Вялікага Кастрычніка.

Малады рэжысёр В Вольгурт ставіць п'есу балгарскага драматурга О. Васілева «Зямны рай». Тэатр таксама будзе працаваць над пастаноўкай п'есы «Пагібель эскадры» А. Карнейчука і над новай п'есай К. Крапівы «Трэцяя асоба».

Праспект імя І. В. Сталіна

☆

Іван ШАМЯКІН

☆

Праспект імя Сталіна!

Колькі велічы і колькі хвалюючага сэнсу ў гэтых простых і родных словах! З радасцю чытаем мы, жыхары новага Праспекта, надпісы на сваіх новых шматпавярховых прыгожых дамах — «Праспект імя Сталіна».

Гэтая назва хвалюе і радуе не адных мінчан, а ўсіх працоўных рэспублікі, якія прымалі самы актыўны ўдзел у аднаўленні сваёй сталіцы.

Праспект Сталіна... Гэта не проста назва самай прыгожай цэнтральнай вуліцы горада. У словах гэтых — гісторыя **новага** Мінска, горада, які падняўся з попелу і руін, горада славы і гераізма беларускага народа, гістэрыя яго вызваліцеляў і будаўнікоў — наша гісторыя. Яе пачатак — у недалёкім мінулым. У кожнага з нас падзеі гэтай гісторыі стаяць перад вачыма, яны назаўсёды ў нашых сэрцах.

... Чэрвень. 1944 год. Недзе за Оршай па шырокім шасе рухаецца ад Смаленска шматлікая тэхніка едуць і ідуць салдаты непераможнай арміі. Іх паслаў вялікі палкаводзец для ажыццяўлення геніяльнага сталінскага пятага ўдару, для вызвалення беларускага народа з фашысцкай няволі. Салдаты спыняюцца на шасе, глядзяць спачатку на ўсход, у бок Масквы, потым доўга ўзіраюцца на захад, у роўную ленту пабітага асфальту і за дымам прыфрантавых пажараў бачаць Мінск. Яны ведаюць, у што ператвараюць фашысты совецкія гарады, адступаючы пад ударамі Совецкай Арміі—і ў іх баляць сэрцы па роднай беларускай зямлі, па Мінску. Яны з надзеяй глядзяць на шасе. Гэта — дарога адвечнай дружбы беларускага і рускага народаў. Масквічы называюць яе Мінскім шасе, беларусы — Маскоўскім.

Па гэтым шасе 3 ліпеня совецкія танкі ўвайшлі ў Мінск. Страшэнную карціну ўбачылі воіны-вызвалцелі на першай-жа вуліцы горада — Пушкінскай. Але яшчэ больш жахлівую карціну прадстаўляла сабой Совецкая вуліца. З канца ў канец ляжалі груды пабітай цэглы, дымяліся пажарышчы. Ні аднаго цэлага будынка! Балюча было глядзець у тыя дні на Мінск. Ды мінчане не адчайваліся — не ўласціва гэта совецкім людзям. Яны ведалі: маці Расія, Масква, бацька Сталін дапамогуць ім аднавіць родны горад. І людзі з першага дня закасалі рукавы для гераічнай працы, такой-жа мужнай і гераічнай, якім было іх змаганне супраць ворага ў дні фашысцкай акупацыі.

... Па ўказанню Цэнтральнага Камітэта партыі і Саюзнага ўрада прыехалі ў Мінск архітэктары з Масквы, Ленінграда, каб дапамагчы беларускім архітэктарам, прыехалі інжынеры, спецыялісты, кваліфікаваныя рабочыя. Прышлі эшалоны з машынамі і будаўнічымі матэрыяламі, з абсталяваннем для заводаў. Натхнёны гэтай велізарнай дапамогай рускага народа і другіх братніх народаў, з выключным гераізмам працаваў у першую пасляваенную сталінскую пяцігодку беларускі народ. За надзвычай кароткі тэрмін выраслі ў Мінску індустрыяльныя гіганты ўсесаюзнага значэння — аўтамабільны і трактарны заводы, а таксама дзесяткі іншых заводаў, электрастанцыі.

Хутка будаваўся новы Мінск. Быў цалкам рэканструяваны цэнтр горада, яго цэнтральныя вуліцы. На іх адзін за адным выраслі вялікія прыгожыя будынкі.

Усё найлепшае, што будавалася ў рэспубліцы і ў Мінску, народ звязаў з імем Сталіна.

Мне прыгадаўся адзін выпадак, які я назіраў яшчэ два гады назад. Аўтобус ішоў з Камароўкі. Недалёка ад Круглай плошчы пажылы рабочы сказаў, звяртаючыся да сына, хлапчука год дванаццаці:

— Глядзі, сынок, зараз выедзем на Праспект Сталіна. Я працую тут...

— На Совецкую вуліцу, — паправіла яго нейкая бойкая дзяўчына.

— Не, дачка, мы будаўнікі, даўно называем гэтую цудоўную вуліцу Праспектам таварыша Сталіна. Ды інакш і нельга. Сталін даў нам магчымасць збудаваць такі горад.

Так нараджалася ў народзе мара назваць найлепшую вуліцу горада імем правадыра.

... 21 верасня 1952 года. Сто тысяч мінчан і прадстаўнікоў другіх гарадоў і раёнаў рэспублікі сабралася на Цэнтральнай плошчы, каб урачыста адкрыць манумент Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Збудаванне гэтага велічнага манумента — яшчэ адно праяўленне бязмежнай удзячнасці і любві беларускага народа да таварыша Сталіна.

Многалюдна ў гэтыя дні на Праспекце імя Сталіна. Прыемна і радасна прайсціся па яго шырокіх тратуарах, пад залатымі ліпамі, прыемна глядзець, як хутка скідаюць рыштаванні новыя цудоўныя будынкі — Дзяржаўны банк, жылы дом побач з ім, дамы на рогу вуліцы Валадарскага. Будаўнікі выконваюць сваё абавязацельства. Радасна зайсці ва універмаг, у магазін кветак, у «Дзіцячы свет», дзе можна ўсё купіць для нашых найшчаслівейшых у свеце дзяцей.

Прыемна праехаць на тралейбусе ад шырокай Прывакзальнай плошчы да Круглай, на якой пачаліся работы па ўзвядзенню манумента совецкім воінам і партызанам, што аддалі сваё жыццё за наш сённешні светлы дзень, за шчасце ўсяго народа.

Прыемна і радасна прыйсці дамоў і напісаць пісьмы блізкім і знаёмым, паведаміць ім свой новы адрас:

Праспект імя Сталіна.

Манумент правадыра

☆

З. АЗГУР,

народны мастак БССР, кіраўнік брыгады скульптараў.

☆

Калі ідзеш сёння па цудоўнай магістралі сталіцы — бачыш і ўсім сэрцам адчуваеш: колькі ўкладзена сюды натхнёнай творчай працы народа, каб апраўдаць пачэснае права прысвоіць гэтаму праспекту імя вялікага Чалавека нашай эпохі!

Прыемна і радасна адчуваць, што беларускія скульптары разам з усім народам таксама прыклалі шмат творчых намаганняў, каб стварыць вобраз правадыра, імя якога носіць сёння самы прыгожы і велічны праспект Мінска.

З незвычайным натхненнем і ўздымам працавала група беларускіх скульптараў і архітэктараў над манументам вялікага Сталіна. Гэта першы буйны твор, які заняў велізарнае месца ў творчай біяграфіі беларускіх скульптараў.

Работа над манументам была даручана скульптарам Глебаву, Бембелю, Селіханаву і мне, архітэктарам Заборскаму і Каролю. Партыя і ўрад аказалі нам высокую чэсць, даверыўшы выканаць манумент вялікага генія чалавецтва таварыша Сталіна. Мы бязмежна ўдзячны партыі і ўраду за гэтае давер'е.

Дзевяціметровая статуя выконвалася ў самым лепшым і светлым цэху Мінскага аўтамабільнага завода. Рабочыя, будаўнікі і інжынеры аўтазавода ўсё падрыхтавалі для таго, каб работа ішла з поспехам. У выкананні манумента прынялі ўдзел і рабочыя горада Мінска.

У працэсе работы нашымі дарадчыкамі і крытыкамі былі рабочыя, будаўнікі, навуковыя работнікі, пісьменнікі і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый горада. Гэта дапамагло нам своечасова закончыць манумент.

Цяпер мы з упэўненасцю можам сказаць, што ў Беларусі ёсць усе магчымасці выконваць манументальныя творы буйных маштабаў.

Бронзавая статуя, устаноўленая на гранітным п'едэстале, уяўляе манументальны партрэт вялікага Сталіна.

У складаных па зместу формах мы імкнуліся як можна паўней паказаць характар вялікага зодчага комунізма, які смела і ўпэўнена глядзіць у будучыню.

Мы імкнуліся адлюстраваць у спакойнай фігуры рысы, уласцівыя таварышу Сталіну, у якіх мы бачым Перамогу і Мір на зямлі.

Праходзячы па Праспекту імя І. В. Сталіна, мы бачым светлы воблік любімага друга народа, таварыша Сталіна. І нам хочацца, каб кожны, углядаючыся ў дарагія рысы яго твару, сказаў:

— Гэта ён глядзіць на мяне і клапоціцца пра мяне. І таму ў мяне так цёпла на душы ад гэтага пагляду.

Кампазіцыя манумента выканана з улікам будынкаў, якія ўжо ўзведзены і будуць узводзіцца на плошчы і якія яшчэ больш падкрэсляць велічнасць манумента.

Няхай гэты твор будзе нашым укладам у новы пяцігадовы план, вызначаны вялікім правадыром.

Няхай жыве наш родны і вялікі Сталін на радасць усім народам свету!

Настольная кніга мільённых мас

1 кастрычніка споўнілася 14 год з дня выхаду ў свет геніяльнай працы таварыша І. В. Сталіна «Гісторыя Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў). Кароткі курс». Гэтая кніга — сапраўдная энцыклапедыя асноўных ведаў марксізма-ленінізма, найвялікшая скарбніца рэволюцыйнай тэорыі і рэволюцыйнага вопыту.

Па Кароткаму курсу гісторыі партыі авалоднаюць навукай перамогі над старым капіталістычным светам мільённыя масы працоўных як у нашай краіне, так і далёка за яе межамі. Сталінскі Кароткі курс стаў самай любімай і самай папулярнай кнігай ва ўсім свеце.

За 14 год у нашай краіне гэтая кніга вышла на 67 мовах народаў СССР тыражом звыш 41 мільёна экземпляраў.

Чатыры разы выдавалася яна на беларускай мове агульным тыражом у 250 тысяч экземпляраў.

Кароткі курс гісторыі партыі выдадзены ў перакладзе на большасць моваў народаў усяго свету. Дванаццаць выданняў кнігі вышла ў Чэхаславакіі, восем — у Балгарыі; у Румыніі агульны тыраж дасягнуў аднаго мільёна экземпляраў. Комуністычная партыя Грэцыі выпусціла чатыры выданні кнігі.

Усяго за межамі нашай краіны кніга вышла больш чым у 250 геаграфічных пунктах.

Пачатак навучальнага года ў сістэме партыйнай асветы

1 кастрычніка ў гарадах краіны пачаўся навучальны год у сістэме партыйнай асветы.

У гэтым годзе вялікая група пісьменнікаў, работнікаў тэатральнага мастацтва, дзеячоў музыкі, мастакоў вучыцца ў вячэрнім універсітэце марксізма-ленінізма пры Мінскім гаркоме КП(б)Б.

Больш 100 чалавек паступіла на першы курс універсітэта.

На другім курсе займаюцца 86 чалавек, сярод іх — народны мастак Беларусі І. Ахрэмчык, лаўрэаты Сталінскіх прэмій М. Танк, К. Саннікаў, Л. Ржэцкая.

Падпісчыкі атрымліваюць творы Я. Коласа

У гэтыя дні асабліва людна ў мінскім магазіне падпісных выданняў. Прыбыў пяты том твораў народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

Да прылаўка падыходзіць пяцідзесяцігадовы рабочы Канстанцін Рыгоравіч Аўчыннікаў. На 2 тысячы рублёў мастацкай літаратуры атрымаў ён у гэтым годзе. У бібліятэцы Канстанціна Рыгоравіча — творы Пушкіна, Гогаля, Горкага, Купалы. Зараз ён атрымлівае творы Якуба Коласа.

— Якуб Колас — мой любімы паэт, — гаворыць Канстанцін Рыгоравіч. — Яго творы вучаць самаадданай любві да Радзімы.

Творы Коласа атрымліваюць таксама рабочы-будаўнік Г. Пліско, настаўнік В. Вярбіла, студэнт М. Сяргей і іншыя. За апошні час падпісчыкам прадана на 10 тысяч рублёў твораў народнага паэта.

Новыя творы

П'еса аб аўтазаводцах

Драматург Кандрат Крапіва напісаў новую п'есу аб рабочых і інжынерна-тэхнічнай інтэлігенцыі Мінскага аўтазавода. Гэта першы ў беларускай драматургіі буйны твор на тэму аб рабочым класе, твор удалы, з цікавым жыццёвым канфліктам, напісаны сакавітаю вобразнаю мовай.

У абмеркаванні п'есы ў Саюзе пісьменнікаў прынялі ўдзел пісьменнікі, артысты і рэжысёры тэатра імя Янкі Купалы, прадстаўнікі Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР.

— Новая п'еса Крапівы, — сказаў А. Куляшоў, — мяне па-сапраўднаму ўсхвалявала значнасцю канфлікта, багаццем інтэлекта герояў, праўдзівым адлюстраваннем нашага жыцця. Сцэна ў кабінеце міністра сапраўды наватарская. Яна напісана свежа, з добрым густам, пачуццём меры. Вобраз міністра — дзяржаўнага дзеяча — вельмі прывабны і чалавечны. Заключная карціна — на Волга-Данскім канале — правільная па сваёй задуме. Яна надае перспектыву героям п'есы.

А. Куляшоў зрабіў асобныя крытычныя заўвагі. На яго думку, у некаторых карцінах п'есы адчуваецца пэўная затрымка ў развіцці дзеі. Не зусім абгрунтавана пастанова парткома аб вызваленні Сухадольскага з пасады галоўнага інжынера.

Значнасць п'есы, гаворыць П. Броўка, заключаецца ў тым, што ў ёй багата думак і пачуццяў. У цэнтры падзей — галоўны герой п'есы — канструктар Русаковіч. Варта было-б яшчэ глыбей паказаць яго, як наватара, носьбіта перадавых ідэй у тэхніцы. Праўдзіва намаляваны вобраз галоўнага інжынера Сухадольскага — чалавека, адсталага ад жыцця, які стрымлівае творчую ініцыятыву лепшых людзей завода. Удаўся драматургу вобраз сакратара парткома Страміліна. Адпавядае жыццёвай праўдзе вобраз Генадзія — разбэшчанага юнака, ахвяры абыякавых адносін бацькоў да яго выхавання.

— П'еса каштоўная дзяржаўным маштабам праблемы, якая ў ёй пастаўлена, глыбокім адлюстраваннем жыцця аўтазавода,— адзначыў І. Шамякін. На яго думку, мітынг у першай карціне вельмі перагружаны прамовамі. У п'есе часта паўтараюцца сцэны ў кабінетах. Шамякін аспрэчваў мэтазгоднасць назвы п'есы «Трэцяя асоба».

Згадзіўшыся з агульнай станоўчай ацэнкай п'есы, А. Маўзон разам з тым лічыць, што ў пачатку п'есы вобраз Страміліна даволі пасіўны. Драматургу варта больш рэзка і востра акрэсліць адмоўныя рысы Сухадольскага — галоўнага віноўніка недасканаласці многатонных самазвалаў.

К. Саннікаў адзначыў, што калектыў тэатра імя Янкі Купалы глыбока зацікаўлены новай п'есай Кандрата Крапівы.

А. Кучар, Я. Садоўскі, І. Гурскі, В. Вітка і Л. Кацовіч, падкрэсліўшы глыбокі змест і значныя мастацкія якасці новай п'есы, таксама зрабілі асобныя заўвагі. Было выказана пажаданне, каб апошняя карціна п'есы была пазбаўлена ідылічнасці. Неабходна зрабіць яе больш дзейснай, па-магчымасці паказаць лёс тых людзей (Целеша і іншых), якія замінялі заводу плённа працаваць для вялікіх будоўляў комунізма.

У заключным слове К. Крапіва абяцаў улічыць слушныя заўвагі і дапрацаваць п'есу.

Паэма А. Куляшова

На паседжанні прэзідыума праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР абмеркавана новая паэма Аркадзя Куляшова.

Аўтар вяртаецца да юнацтва герояў сваіх паэм «Сцяг брыгады» і «Толькі ўперад», паказвае вытокі гераізма совецкіх людзей, што праявіўся ў час вялікіх выпрабаванняў.

Дзея паэмы разгортваецца задоўга да Вялікай Айчыннай вайны ў адным з пагранічных раёнаў.

Ярка і ўсхвалявана расказана ў паэме аб тым, як нараджалася маральна-палітычнае адзінства нашага народа, як у жорсткай барацьбе з ворагамі народа — агентамі падпальшчыкаў вайны — умацоўваўся дружны совецкі калектыў, фармаваліся характары маладых совецкіх людзей, іх маральнае аблічча.

Глыбокія мастацкія абагульненні, пераканальнасць многіх вобразаў, умелае спалучэнне лірычнай і публіцыстычнай плыняў у паэме надаюць ёй актуальнае гучанне. Гэтую асаблівасць новай паэмы А. Куляшова падкрэслілі ў сваіх выступленнях В. Барысенка, Ул. Карпаў

А. Вялюгін, А. Кучар, А. Бачыла і другія адзначылі высокае майстэрства верша паэмы.

Большасць выступаўшых выказала думку, што паэма з'яўляецца дасягненнем А. Куляшова.

Разам з тым на абмеркаванні быў выказаны і рад сур'ёзных крытычных заўваг па паэме. Так, М. Танк і Д. Кавалёў указалі ў сваіх выступленнях на празмерную складанасць сюжэта паэмы.

К. Крапіва, падкрэсліўшы высокія мастацкія якасці паэмы, адзначыў яе некаторую кампазіцыйную рыхласць. Гэта, па яго думцы, вынік перагружанасці паэмы дзеючымі асобамі і адсутнасці ў ёй цэнтральнага героя. Героі ў асноўным намаляваны штрыхамі, і гэта робіць іх як-быццам эпізадычнымі персанажамі.

В. Вітка адзначыў, што некаторыя вобразы паэмы не зусім выразныя таму, што паэма з'яўляецца ў пэўным сэнсе пралогам да «Сцяга брыгады» і «Толькі ўперад». В. Вітка не згодны з тым, што ў паэме нібыта невыразны сюжэт. Сюжэт якраз, на яго думку, востры і цікавы. Сур'ёзным недахопам паэмы ён лічыць адсутнасць канкрэтнага гістарычнага фона, выразных адзнак часу, у які адбываюцца падзеі.

Гэтая-ж думка была выказана ў выступленнях Ул. Карпава І. Гурскага.

П. Броўка адзначыў, што паэма ўвогуле ўдалася. Новай якасцю ў творчасці А. Куляшова з'яўляецца яе эпічная шырыня. Гэта, па сутнасці, аповесць у вершах. Неабходна, сказаў П. Броўка, дапрацаваць асобныя вобразы, зрабіць больш выразным сюжэт, а таксама яшчэ больш наблізіць паэму да сучаснасці.

У заключным слове А. Куляшоў адзначыў, што работа над паэмай яшчэ не закончана. Ён згадзіўся з радам крытычных заўваг і абяцаў улічыць іх у далейшай рабоце над творам.

Летапіс жыцця народа

☆

Анатоль ВЯЛЮГІН

☆

Нядаўна ў Маскве дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры выпусціла ў свет Анталогію беларускай паэзіі. Гэта вялікая падзея не толькі ў літаратурным жыцці.

Лепшыя прадстаўнікі рускай совецкай літаратуры прынялі ўдзел у перакладах для Анталогіі беларускай паэзіі. Сярод іх імёны, блізкія сэрцу кожнага чытача: Максім Горкі і Міхаіл Ісакоўскі, Аляксандр Твардоўскі і Самуіл Маршак, Нікалай Ціханаў і Канстанцін Сіманаў, Міхаіл Святлоў і Віктар Гусеў, Аляксандр Пракоф'еў і Міхаіл Лазінскі. Чытаючы Анталогію, мы сустракаем прозвішчы лепшых рускіх паэтаў-перакладчыкаў: Міхаіла Галоднага і Нікалая Забалоцкага, Ольгі Бергольц і Арсенія Таркоўскага, Аляксандра Гатава і Веры Звягінцавай, Якава Хелемскага і Дзмітрыя Осіна, Нікалая Сідарэнкі і Пятра Сямыніна.

Шматмільённы чытач Совецкай Радзімы знойдзе ў Анталогіі лепшыя ўзоры беларускай паэтычнай творчасці. Нашая паэзія пададзена ў кнізе больш чым за стагоддзе: пачынаючы з першых рукапісных твораў 30-х гадоў XIX ст. і канчаючы вершамі маладых паэтаў, што выступілі ў літаратуры пасля Вялікай Айчыннай вайны.

Беларуская паэзія сапраўды па-народнаму простая, шчырая і баявая, гучала і гучыць як голас мужнага і працавітага народа. Толькі дзякуючы моцным сувязям з жыццём працоўных мас яна ў сваім развіцці шчасліва абмінула каўдобіны дэкаданса і фармалізма. Таму Анталогію чытаеш, як летапіс жыцця народа, які ў страшныя гады беспрасвецця дбаў аб светлай долі, змагаўся за гэтую долю поруч са сваім старэйшым братам — рускім народам і дзякуючы Кастрычніку, вялікім Леніну і Сталіну вышаў на сонечныя разлогі, набыў сапраўдныя чалавечыя правы, сваю дзяржаўнасць і шчасце. Не раз праславіўся гэты народ на суровым полі бітвы, мужна адстойваючы свае правы і шчасце, а сёння разам з дружнай сям'ёю народаў социялістычнай Радзімы руплівым крокам будаўніка ідзе да найвышэйшай вяршыні чалавечага шчасця, вяршыні, гэтак блізкай для нас.

Па Анталогіі можна прасачыць шлях беларускага народа да свайго шчасця і славы. Усе творы ў кнізе пададзены ў гістарычна-літаратурнай паслядоўнасці.

Пачынаецца Анталогія з паэмы невядомага аўтара «Тарас на Парнасе», якая напісана ў першай палове XIX стагоддзя.

Паэма выдатна перакладзена на рускую мову Міхаілам Лазінскім. Аб якасці перакладу можна меркаваць хоць-бы па другому раздзелу, моўная фактура якога вельмі самабытная і каларытная і, на першы погляд, не падаецца перакладу. У перакладзе Лазінскага гэты раздзел мы чытаем і здзіўляемся,—як быццам ён напісаны на добрай народнай рускай мове:

На самого Кузьму-Демьяна
Пошел я в пущу через мхи;
В то утро я поднялся рано,
Едва пропели петухи.
Иду себе я понемногу
И на пенёк в лесу присел.
А тут — лоп-лоп! Через дорогу —
Глянь! — тетерев перелетел.
Навёл двустволку—щёлк!—осечка...
і г. д.

Добра прадстаўлены ў Анталогіі буйнейшыя беларускія паэты XIX стагоддзя — Францішак Багушэвіч і Янка Лучына, а таксама паэтэса-рэволюцыянерка Цётка. Рускі чытач пазнаёміўся з паэзіяй Францішка Багушэвіча па кнізе яго выбраных твораў, выдадзенай у Маскве пасля вайны. З творчасцю Янкі Лучыны і Цёткі ён знаёміцца амаль што ўпершыню, калі не лічыць Анталогіі беларускай паэзіі, якая вышла ў Ленінградзе ў 1948 годзе. Рэволюцыйна-дэмакратычны рэалізм вялікай рускай літаратуры накіроўваў і фармаваў творчасць Францішка Багушэвіча і Янкі Лучыны. Першы з іх, як сведчаць гісторыкі і літаратуразнаўцы, удзельнічаў у паўстанні пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Другі, закончыўшы Пецербургскі тэхналагічны інстытут, доўгі час знаходзіўся ў асяроддзі рускага рабочага класа. У чыгуначных майстэрнях на Каўказе ён пазнаёміўся з Аляксеем Максімавічам Горкім, які пасля рэволюцыі ўспамінаў яго добрым словам.

Мы адразу-ж мусім зрабіць закід укладальніку Анталогіі, які, робячы кароткія біяграфічныя даведкі аб аўтарах такога важнага выдання, чамусьці ніводнага слова не сказаў пра социяльны змест творчасці Францішка Багушэвіча і Янкі Лучыны. У іх вершах мы выразна чуем гнеўны пратэст супраць прыгнятальнікаў-паноў і цара. Пад уплывам гэтых вершаў фармавалася творчасць пясняркі рэволюцыі 1905 года Цёткі: гэтыя вершы зрабілі велізарны ўплыў на Янку Купалу і Якуба Коласа.

Творы Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны і Цёткі перакладалі С. Маршак, А. Таркоўскі, П. Сямынін, М. Камісарава, Н. Браун, Б. Кежун, В. Раждзественскі, П. Дружынін, Д. Бродскі і К. Цітоў. Асабліва хочацца адзначыць працу С. Маршака — цудадзея ў мастацкім перакладзе. Нядаўна выдадзена кніга яго перакладаў. Там, побач з творамі Шэкспіра, Бернса, Гейнэ і другіх класікаў сусветнай літаратуры, знаходзім вершы беларускіх паэтаў. І паглядзіце, як хораша, непасрэдна гучаць гэтыя вершы:

Правду молвит люд крещёный
Что мужик дурней вороны.

Плох его топорик жалкий,
Да в руках его летает.
Лес уложит он вповалку —
Свет дровами закидает!
Для своей же дымной печки
Рушит лавку на дощечки.

Вот откуда слухи-звоны,
Что мужик дурней вороны!

(Ф. Багушэвіч. «Дурны мужык, як варона»).

Усе мы помнім тэкст тэлеграмы Аляксея Максімавіча Горкага ў сувязі з 30-годдзем літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы, помнім словы вялікага гуманіста нашага часу, друга Леніна і Сталіна, словы, ў якіх дадзена сапраўдная ацэнка творчасці народнага паэта Беларусі: **«Сардэчнае прывітанне нястомнаму саратніку, паэту і рэволюцыянеру. М. Горкі».** У Беларусі імя Купалы, яго песні сталі славаю народа. Народжаная рэволюцыяй 1905 года, купалаўская паэзія гэтак зліта з жыццём беларуса, што мы сёння не можам уявіць без вершаў і паэм Купалы шлях нашага народа за апошнія сорак год. Народная, самабытная паэзія Купалы — рэволюцыйная па свайму зместу, глыбока інтэрнацыянальная. У дні суровага змагання кітайскага народа за сваю незалежнасць, словы нашага паэта дайшлі да далёкага Кітая, і там сярод байцоў Народнай арміі гучалі баявыя строфы верша-гімна «Беларускім партызанам».

Надзвычай добра, у гістарычнай паслядоўнасці пададзена ў Анталогіі творчасць Янкі Купалы. Тут і першы яго друкаваны твор «Мужык», і верш «А хто там ідзе?», яшчэ да рэволюцыі перакладзены на рускую мову Максімам Горкім, паэма «Курган» і вершы «Арлянятам», «Сыходзіш, вёска, з яснай явы», «Песня будаўніцтву», «Алеся», «Сыны», «Табе, правадыр...», паэма «Над ракою Арэсай» і вершы, напісаныя ў час Вялікай Айчыннай вайны.

У трыццатыя гады Міхаіл Галодны пераклаў купалаўскі «Лён». Аляксей Максімавіч Горкі, прачытаўшы верш, напісаў на першай старонцы перакладу кароткае, харошае слова: «Славно!». Купалу перакладалі амаль што ўсе совецкія паэты. У Анталогію ўключаны самыя лепшыя пераклады. Возьмем, напрыклад, верш «Алеся». У ленінградскай «Анталогіі беларускай паэзіі» ён перакладзены В. Раждзественскім. У Купалы першыя дзве страфы гучаць так:

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Гадавала матуля
Дачушку Алесю.

Гаманіў бор сасновы
У вечары і ранкі,
Над калыскай ліповай
Пела калыханкі.

Пераклад В. Раждзественскага:

Куковала кукушка
Во зелёном лесочке.
Мать качала в избушке
Свою малую дочку.

И шумел бор сосновый
Ввечеру, спозаранку,
Над плетёнкой кленовой
Пела мать «колыханку».

Колькі ў гэтым перакладзе недакладнасцей — амаль у кожным радку знаходзіш іх; колькі лішніх слоў — ненатуральных, непатрэбных, неадпаведных простай, празрыстай страфе арыгінала! Папершае, «во зелёном лесочке» — выраз, які настройвае на лёгкі лад вядомай любоўнай песні, а ў арыгінале — роздум, думы аб лёсе народа, краіны. «Мать качала в избушке свою малую дочку» — радкі, дзе многа лішняга. Вядома, што дачка, якую закалыхваюць, малая. Значыць, словы «свою малую» непатрэбныя. Словы «в избушке» ўжыта толькі дзеля рыфмы. У другой страфе зусім бессэнсоўны радок: «Над плетёнкой кленовой». Гаворка-ж ідзе аб калысцы, а не аб «плетёнке», а калыску, ды і «плетёнку», ніхто не робіць з кляновага лыка.

Як выглядае пераклад «Алесі» ў новай Анталогіі? Міхаіл Ісакоўскі пераклаў верш творча, захаваўшы купалаўскі настрой, яснасць, стрыманасць у словах:

На заре куковала
Кукушка в Полесье.
Мать ласкала, качала
Дочурку Алесю.

Тьма ложилась ночная,
Сосны глухо шумели.
Песню мать напевала
У родной колыбели.

Гэткай-жа выразнасцю вызначаюцца пераклады М. Ісакоўскага вершаў народнага паэта Якуба Коласа. У творчасці Якуба Коласа знайшлі свой адбітак важнейшыя падзеі ў гісторыі нашага народа, змаганне за свабоду, гераіка грамадзянскай вайны, пафас социялістычнага будаўніцтва, бітвы Айчыннай вайны, барацьба за мір. Пясняр сталінскай дружбы народаў, Якуб Колас стварыў шмат эпічных паэм, якія з'яўляюцца своеасаблівай энцыклапедыяй жыцця беларусаў.

Шырока знаёміць Анталогія з творчасцю Максіма Багдановіча — чалавека вялікай паэтычнай культуры, удумлівага крытыка, перакладчыка з рускай, французскай, іспанскай, японскай, нямецкай і фінскай моваў.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Анталогія беларускай паэзіі. Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры. Масква, 1952, стар. 562. Пад рэдакцыяй А. Твардоўскага, Ц. Гарбунова, Н. Брауна, С. Ірыніна.

На сцэне сталічных тэатраў

„Яе сябры“



Арт. Г. Раксанава ў ролі Людмілы Шаровай.

У вялікім і ўтульным пакоі кватэры Шаровых багата сонца, паветра і святла. Сям'я совецкіх людзей жыве культурна і радасна. Асабліва прыемна бацькоўскаму сэрцу, што адзіная дачка — вучаніца дзесятага класа Людміла — за выдатныя поспехі ў вучобе павінна атрымаць залаты медаль.

Але сёння чамусьці парушаны звычайны парадак у доме. Дзмітры Паўлавіч Шароў (артыст І. Жараў) ніяк не дачакаецца жонкі Анны Грыгор'еўны (артыстка М. Кузьменка) і дачкі са школы. «Ці не здарылася што?» — з трывогай думае Шароў. Раптам пачуўся званок з калідора. Спяшаючыся насустрач родным, Дзмітры Паўлавіч замест дачкі і жонкі сустракае класнага кіраўніка Валянціну Васільеўну. Яна расказвае аб дзіўных паводзінах Людмілы ў апошні час. Дзяўчына стала нервовай, упершыню атрымала тройку.

Цяжкім каменем ляжа на сэрца блізкіх гэтая вестка аб дачцы.

Так пачынаецца спектакль па п'есе В. Розава «Яе сябры» ў рэспубліканскім рускім тэатры (рэжысёр А. Нікіцін, мастак Л. Кроль).

Станоўчай рысай п'есы і спектакля з'яўляецца тое, што драматычны канфлікт разгортваецца з першага знаёмства з героямі. Рэжысёр паказапаціўся аб тым, каб трывога за Людмілу ахапіла не толькі яе родных, але і ўсіх гледачоў.

... Павольным крокам, вонкава спакойная і стрыманая на сцэну выходзіць Людміла Шарова (артыстка Г. Раксанава). Але за вонкавым спакоем адчуваецца ўзрушанасць дзяўчыны. У яе вачах відаць напружанасць і пакута. Яны не сведчаць, як заўсёды, цёплай, ветлівай усмешкай. Люся чамусьці ўхіляецца ад сустрачы з уважлівым позіркам маці. Каб суцешыць яе, дзяўчына садзіцца за стол рыхтаваць урокі. Аднак Анна Грыгор'еўна дамагаецца шчырай размовы з дачкою. Адчуваецца цяжкая душаўная барацьба ў Люсі-Раксанавай, барацьба, раскрытая не ў словах, а толькі ў пачуццях, і таму — поўная асаблівага хараства і красамоўнасці. Маці перамагае. Цвёрдае імкненне дзяўчыны перажыць бяду ў адзіноце парушана. Пякучым болем вырываецца прызнанне аб вялікім няшчасці школьніцы, якая пачынае траціць зрок.

Па-майстэрску праводзіць маладая артыстка тэтую сцэну, праяўляючы добры густ і значную мастацкую культуру.

Цяжкія выпрабаванні, якія перажывае Люся, робяць яе больш сталай. Гэта знайшло свой адбітак і ў яе сцэнічным вобразе, які паступова набывае ў спектаклі новыя прывабныя рысы.

Бяда не пазбавіла дзяўчыну сілы волі, не зрабіла яе бездапаможнай. Наадварот, яна стала больш дарослай, настойлівай, рашучай і загартаванай.

Раксанава тактоўна абыходзіць небяспеку меладраматычнага паказу Люсі, як дзяўчыны няшчаснай, хворай, адзінокай сярод здаровых і жыццерадасных таварышаў. Артыстка разумее гора школьніцы не як яе асабістую трагедыю.

Тэма паэтычнага вобраза Люсі-Раксанавай — гэта вера героіні ў канчатковую перамогу над хваробай, у здзяйсненне сваіх мар. Гэтая вера гучыць у сардэчнай размове вучаніцы з дырэктарам школы (артыстка А. Савіна), у сустрэчах з таварышамі, перад складанай аперацыяй у сталічнай клініцы.

У заключнай сцэне спектакля Раксанава з глыбокім хваляваннем апавядае аб шчасці дзяўчыны, якую совецкая навука вярнула да поўнакроўнага жыцця, дала ёй магчымасць зноў убачыць сонца і святло. Артыстцы ўдалося пазбегнуць сантыментальнасці. Яе настрой здаровы, ёй грунтуецца не на рамантычных ілюзіях, а на рэалістычным светаадчуванні чалавека сацыялістычнага грамадства.

Людміла Шарова ў выкананні Г. Раксанавай — гэта совецкая дзяўчына, перад якой жыццё адкрывае шырокія далягляды.

У яе ёсць шчырыя сябры, якія падалі ёй руку дапамогі ў сумныя дні хваробы і падзялілі радасць выздараўлення.

Анна Грыгор'еўна-Кузьменка — вобраз сапраўднай совецкай маці, актыўнага будаўніка новага жыцця і выхавацеля маладога пакалення, найбольш шчыры сябра сваёй дачкі Люсі.

Моцную дружбу, якая ўласціва калектыву совецкіх школьнікаў, па-рознаму выказваюць таварышы Люсі — дзесяцікласнікі Пеця Якаўлеў (артыст В. Беляноў), Святлана Бутава (артыстка Е. Весніна), Нікіта Зарубін (артыст А. Кашкер) і другія.

Апрача Святланы-Веснінай—яркага камедыйнага вобраза, аўтар п'есы не надаў школьнікам такіх багатых індывідуальных рысаў, якія далі-б магчымасць кожнаму маладому актору стварыць змястоўны мастацкі вобраз.

Запамінаюцца каларытныя фігуры Ірыны Бутавай (артыстка Т. Трушына) і хатняй работніцы Нюшы (артыстка С. Мацюкевіч). На вобразе Бутавай у спектаклі пастаўлена і вырашана праблема выхавання вучня ў сям'і, паказана, наколькі згубна патуранне капрызам дзіцяці, якое развівае ў яго сябелюбства, эгаізм.

Спектакль «Яе сябры» пастаўлены маладым рэжысёрам А. Нікіціным з добрым густам і будзе спрыяць выхаванню ў юнацтва комуністычнай маралі.

М. МОДЭЛЬ.

„Іаланта“

Беларускі Дзяржаўны тэатр оперы і балета ажыццявіў пастаноўку «Іаланты» П. І. Чайкоўскага.

Пастановачная група (дырыжор Б. Афанасьеў, рэжысёр О. Маралёў, мастак П. Масленікаў і хормайстар Т. Арлова) з выключнай увагай паставілася да ўвасаблення на сцэне выдатнай оперы.

Асаблівай увагі заслугоўвае работа дырыжора. Б. Афанасьеў упершыню стаў за дырыжорскі пульт опернага тэатра. Аднак ён даволі глыбока раскрывае багатую і складаную партытуру «Іаланты». Разам з тым трэба папярэдзіць маладога дырыжора ад некаторай аднабаковасці трактоўкі твора.

«Іаланта» — лірычная опера, «драматызаваная лірычная паэма», як назваў яе Б. Асаф'еў. Гэта асабліва адчуваецца ў першай экспазіцыйнай карціне. Між тым, дырыжору і салістам паўней удалося перадаць змест музыкі другой палавіны оперы, дзе пераважаюць драматычныя моманты.

У Б. Афанасьева аркестр гучыць даволі мякка, але ў некаторых месцах, калі дырыжор захапляецца сілай гучання, некалькі заглушаюцца спевакі. Нават такія параўнальна яркія галасы, як у А. Высправаи (Іаланта) і Н. Сярдобава (маўрытанскі ўрач), не ў стане спаборнічаць з меднай групай аркестра. За тое месцы, якія патрабуюць гукавой насычанасці (фінал оперы), і месцы, дзе аркестр застаецца адзін (аркестровае заключэнне арыі караля), удаліся дырыжору і з'яўляюцца найбольш цікавымі ў яго трактоўцы.

Арт. А. Высправа ў ролі Іаланты.

Недапрацаванай засталася інтрадукцыя оперы. Дырыжору неабходна патрабаваць ад саліруючай групы нізкіх драўляных духавых інструментаў лепшага выканання сваіх партый.

Работа маладога рэжысёра О. Маралёва вызначаецца тонкім густам і яснасцю задумы. Па-майстэрску зроблены мізансцэны жаночых хораў, сцэна Вадэмона і Іаланты ў эпізодзе з белымі ружамі. Добра вырашана сцэна, калі Вадэмон перадае Роберту свае ўражанні аб Іаланце. Знаходкай рэжысёра з'яўляецца паказ у канцы оперы ансамбля салістаў і хора на авансцэне. Гэта ўзмацняе ўражанне ўрачыстасці, святочнасці, жыццесцвярджальнасці фінала. У спектаклі адчуваецца зладжанасць усяго ансамбля.

Цікавыя вобразы створаны салістамі.

Маўрытанскі ўрач Эбн-Хакія ў выкананні Н. Сярдобава не толькі мудры вучоны, але і добрай душы чалавек, які ад усяго сэрца жадае выздараўлення Іаланты. Н. Сярдобаў надзяляе Эбн-Хакія вялікай цеплынёй, чалавечнасцю, глыбокім спачуваннем да няшчасця Іаланты. Гэта асабліва адчуваецца ў сцэнах урача з каралём, у звароце ўрача да Іаланты. Цудоўна даносіць артыст да слухача філасофскі маналог Эбн-Хакія Н. Сярдобаў правільна зрабіў, калі адмовіўся ад залішняга падкрэслівання элементаў музычнага арыенталізма і ўсходняй арнаментыкі, якія ёсць у мелодыях гэтага маналога.

Кароль Рэнэ ў выкананні М. Зюванава ўладарны, часам нават дэспатычны. Партыя караля выканана артыстам з глыбокім пачуццём, а вядомая арыя «Ужели тайком осужден страдать невинный ангел чистый?» была праспявана выдатна.

А. Высправа добра спявае партыю Іаланты, але сцэнічнае ўвасабленне вобраза яшчэ не зусім дасканалае. Добра праводзіць артыстка сцэну з Вадэмонам і сцэны з сяброўкамі. Але арыёза першай карціны і фінал оперы яшчэ не ў стылі вобраза. Артыстка не данесла да слухача скразную лінію вобраза, яго развіццё.

Запамінальны вобраз бургундскага герцага Раберта стварыў Н. Ворвулеў. Добра прагучала ў яго выкананні вядомая арыя «Кто может сравниться с Матильдой моей». Але ў Раберта-Ворвулева больш парывістасці, страсці, чым рыцарскай высакароднасці. А гэта паўным чынам парушае характар вобраза.

І. Балоцін у ролі бургундскага рыцаря Вадэмона добра праводзіць першую сцэну з Іалантай, паказваючы нарастаючае пачуццё кахання да яе. Саліст з цеплынёй спявае арыёза «Вы мне явились как видение волшебной чистой красоты». Пераканальна, з сапраўдным драматызмам даносіць ён трагічную кульмінацыю гэтай сцэны, якая заканчваецца трагічным воклічам: «Какая мысль: она слепая!» На жаль, гімн «Чудесный дар природы вечной» не ў характары лірычнага тэмбра голаса артыста.

Артысткі В. Валчанецкая, Т. Ніжнікава і Р Асіпенка ў ролях Марты, Брыгіты і Лаўры ўдала дапаўняюць ансамбль салістаў у першай карціне і ў фінале оперы.

Маляўнічыя дэкарацыі зрабіў для спектакля мастак П. Масленікаў. Сад з багатай расліннасцю поўнасцю адпавядае пачуццю здзіўлення Іаланты.

З добрым густам падабраны касцюмы.

«Іаланта» — каштоўны здабытак у рэпертуары опернага тэатра.

Я. ЦІКОЦКІ,
заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

Вечары памяці А. Н. Радзішчэва

Грамадскасць рэспублікі адзначыла 150-годдзе з дня смерці выдатнага рускага пісьменніка А. Н. Радзішчэва. Памяці яго была прысвечана навуковая сесія ў Акадэміі навук БССР. З дакладам «Філасофскія погляды А. Н. Радзішчэва» выступіў доктар філасофскіх навук І. Лушчыцкі. Кандыдат гістарычных навук І. Краўчанка зрабіў даклад на тэму «Гістарычныя погляды А. Н. Радзішчэва», кандыдат эканамічных навук В. Аксельрод — «Аграрнае пытанне ў працах А Н. Радзішчэва».

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна і ўрадавай бібліятэцы імя А. М. Горкага адкрыты выстаўкі твораў пісьменніка і літаратуры аб ім. Сярод кніг на выстаўцы — «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву» ў перакладзе на беларускую мову.

Літаратурны вечар адбыўся ў Саюзе совецкіх пісьменнікаў БССР. З дакладам аб жыцці і дзейнасці А. Н. Радзішчэва выступіў прафесар І. Гутараў. Народная артыстка БССР Л. Ржэцкая прачытала творы пісьменніка — оду «Вольнасць» і ўрывак з «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву».

Маладыя салісты ў оперных спектаклях

У спектаклях тэатра оперы і балета ў галоўных партыях часта выступаюць маладыя артысты — выхаванцы Маскоўскай і Беларускай кансерваторыі, Ленінградскага і рэспубліканскага харэаграфічных вучылішчаў.

Свежа гучаць маладыя галасы ў спектаклі «Яўгені Анегін». Усе галоўныя ролі тут выконвае моладзь. Партыю Тацяны спявае О. Мілаванава, Ольгі—Р. Асіпенка, Ларынай — В. Рызвановіч, няні — К. Кудрашова, Грэміна — С. Івашчанка, Ленскага — Вдавічэнка. Дырыжыруе операй выхаванец Беларускай кансерваторыі І. Абраміс.

Творчая моладзь з поспехам выступіла ў спектаклях, у якіх партыю Ленскага выконваў саліст Вялікага тэатра Саюза ССР народны артыст СССР С. Я. Лемешаў.

У. І. Агіевіч

Пасля цяжкай хваробы памёр член Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР Уладзімір Іванавіч Агіевіч. Смерць вырвала з нашых радоў актыўнага літаратуразнаўцу, прынцыповага крытыка, які аддаваў свае сілы справе вывучэння і развіцця беларускай совецкай літаратуры.

У. І. Агіевіч нарадзіўся ў сям'і бедняка ў вёсцы Пухавічы Жыткавіцкага раёна Палескай вобласці. Працуючы настаўнікам пачатковай школы, ён прымае актыўны ўдзел у калектывізацыі сваёй вёскі. Пасля заканчэння Магілёўскага педагагічнага інстытута У. І. Агіевіч выкладае беларускую літаратуру ў Слуцкім педвучылішчы, у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах Мінска, а таксама займаецца навуковай працай. Першыя артыкулы крытыка аб літаратуры, якія былі надрукаваны яшчэ ў 1940 годзе, звярнулі на сябе ўвагу грамадскасці.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны У. І. Агіевіч добраахвотна ўступіў у Совецкую Армію. Пасля вызвалення Беларусі ад фашыстаў ён вяртаецца ў Мінск, дзе працуе ў Акадэміі навук БССР, у праўленні Саюза совецкіх пісьменнікаў і ў часопісе «Беларусь». На старонках перыядычнага друку часта змяшчаліся яго крытычныя артыкулы, нарысы і рэцэнзіі аб творчасці беларускіх пісьменнікаў. У. І. Агіевіч прымае ўдзел у стварэнні падручніка па гісторыі беларускай літаратуры для сярэдніх школ.

У. І. Агіевіч памёр у росквіце творчых сіл. Памяць аб таленавітым крытыку, патрыёце, сардэчным таварышу доўга будзе жыць у нашых сэрцах.

Я. Колас, П. Броўка, К. Крапіва, М. Лынькоў, А. Куляшоў, М. Танк, І. Гурскі, І. Шамякін, М. Клімковіч, А. Стаховіч, Я. Брыль, В. Барысенка, І. Гутараў, В. Вітка, К. Кірэенка, І. Мележ, У. Краўчанка, П. Кавалёў, А. Міронаў, Э. Агняцвет, П. Панчанка, Я. Шарахоўскі, Я. Маўр, П. Глебка, М. Горцаў, А. Вялюгін, А. Бялевіч, А. Есакоў, А. Зарыцкі, П. Пестрак, С. Майхровіч, І. Кудраўцаў, М. Калачынскі, П. Прыходзька, М. Ракітны, А. Русецкі, В. Мурашоў, М. Ларчанка, Ю. Пшыркоў, А. Кучар, І. Грамовіч, Ф. Алер, В. Бурносаў, Р. Шкраба, А. Семяновіч, В. Івашын, А. Рылько, М. Модэль, Н. Гарулёў, М. Ткачоў, Б. Бур'ян.

У рускай секцыі ССПБ

На паседжанні секцыі рускіх пісьменнікаў ССПБ быў абмеркаваны раман Е. Кабака «Путь к счастью», прысвечаны гераічнай барацьбе працоўных былой Заходняй Беларусі супраць польскіх паноў і нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Былі адзначаны, як дасягненне аўтара, — жыццёвасць і маляўнічасць многіх вобразаў яго твора. Разам з тым заўважана, што ў рамане часта адсутнічае мастацкае абагульненне падзей, паводзіны некаторых герояў не заўсёды псіхалагічна абгрунтаваны. Побач з яркімі вобразамі ёсць і бледныя, безжыццёвыя схемы.

Рад сур'ёзных заўваг зроблены па мове рамана.

У абмеркаванні прынялі ўдзел Я. Садоўскі, Г. Куцэра, Д. Кавалёў, Н. Гарулёў і другія.

Сумеснае паседжанне рускай секцыі і камісіі ССПБ па рабоце з маладымі аўтарамі, якое адбылося 30 верасня, было прысвечана абмеркаванню вершаў маладых паэтаў Н. Цялічкі (Брэсцкая вобласць) і Б. Спрынчана (Гомель).

Трэба адзначыць, што П. Валкадаеў, які выступіў з аглядам вершаў Н. Цялічкі, слаба падрыхтаваўся да абмеркавання, і яго агляд твораў маладога паэта быў даволі павярхоўны.

Д. Кавалёў адзначыў, што ў вершах Н. Цялічкі ёсць нямала свежых вобразаў, сапраўды паэтычных дэталей. Побач з гэтым у яго вершах яшчэ шмат штампаў, аўтар не авалодаў паэтычнай мовай, ён як паэт марудна расце.

М. Танк сказаў, што ў Н. Цялічкі ёсць свае прыёмы, пошукі тэмы, імкненне знайсці мастацкую дэталь, але многія вершы маюць характар замалёвак, пазбаўленых паэтычнай думкі. На адсутнасць глыбокага вырашэння тэмы ў вершах маладога паэта ўказаў А. Вялюгін.

Са сваімі заўвагамі па вершах Н. Цялічкі выступілі таксама В. Бурносаў, А. Якімовіч і др.

Аб лірычнай цеплыні, цікавай задуме многіх вершаў Б. Спрынчана гаварыў А. Вялюгін. Разам з тым ён звярнуў увагу на нізкую культуру верша, на шматлікія моўныя недахопы.

Аб добрым уражанні ад вершаў Б. Спрынчана, іх лірычнасці, шчырасці гаварылі В. Бурносаў, А. Есакоў і другія. Выступаўшыя адзначылі і многія недахопы творчасці Б. Спрынчана.

Секцыя і камісія па рабоце з маладымі пісьменнікамі вырашыла дапамагчы Б. Спрынчану і Н. Цялічку ў падрыхтоўцы першых зборнікаў вершаў, а таксама ў далейшай творчай вучобе.

Агляд творчасці рабочых і служачых

БАРЫСАЎ

Дзесяткі здольных майстроў народнай творчасці Барысава дэманструюць свае дасягненні на фабрычных і заводскіх выстаўках.

Добрую ініцыятыву праявіў заўком шклозавода імя Дзержынскага. Члены заўкома выявілі здольных людзей. У выніку выстаўка мастацкай творчасці рабочых і служачых завода ператварылася ў масавы агляд самадзейнага мастацтва.

Творчай удачы дасягнулі майстры па шклу. Гледачам спадабаўся нацюрморт т. Філімонава — шкляная ваза з фруктамі.

Радуе сваімі поспехамі гравіроўшчык С. Грахоўскі. Яго работы зграбныя па форме, тонкія па малюнку. Але агляд творчасці недастаткова яшчэ разгорнуты.

У арцелі «Новае жыццё» працуе калектыў майстроў вышывальшчыц. Іх рукамі створаны прыгожыя вышыўкі. Заслужанай павагай карыстаюцца майстры керамікі з ганчарнай арцелі «Чырвоны Кастрычнік». Пасуда, настольныя і дзіцячыя цацкі яе вырабу карыстаюцца вялікім попытам.

Калектывы гэтых арцелей маюць усе магчымасці зрабіць цікавыя экспанаты для гарадской выстаўкі выяўленчага мастацтва. Аднак праўленні арцелей не развіваюць творчую ініцыятыву майстроў.

Не рыхтуюцца да выстаўкі і на адным з буйнейшых прадпрыемстваў горада — фанерна-запалкавым камбінаце імя Кірава. Тут нават не выяўлены майстры народнай творчасці.

Выканком горсавета і яго культасветаддзел падрыхтоўку гарадской выстаўкі пусцілі на самацёк. Гарадская камісія (старшыня т. Сівянкоў), якая створана ў жніўні, не кіруе падрыхтоўкай і правядзеннем выставак на прадпрыемствах.

Е. ЛУКОЎСКІ,
В. ЛЫСКАВЕЦ.

БРЭСТ

На абласной выстаўцы работ майстроў народнай творчасці размешчана багата экспанатаў. Лепшымі працамі з'яўляюцца інкрустыраваны па дрэву партрэт А. М. Горкага, зроблены сталяром арцелі «Стаханавец» Д. Сакажынскім, карціна «Сям'я Ульянавых» і жанравая скульптура работы хатняй гаспадыні Е. Хабельман, карціна «Зубры ў Белавежскай пушчы» тэхніка абласнога ўпраўлення сувязі Е. Старастава, «Замалёўкі Брэсцкай крэпасці» шофера І. Ламакіна і другія.

Частка работ будзе паказана на рэспубліканскай выстаўцы выяўленчага мастацтва.

За месяц выстаўку наведалі 9 тысяч гледачоў, у тым ліку экскурсанты з Кобрына, Высокага, вучні школ працоўных рэзерваў, выхаванцы дзіцячых дамоў.

В. ВОЛКАЎ.

Летапіс жыцця народа

(Заканчэнне. Гл. 3 стар.).

У кнізе мы знаходзім творы Канстанцыі Буйлы, Алеся Гурло і Янкі Журбы, якія распачалі літаратурную дзейнасць у дакастрычніцкі час. Трэба заўважыць: чамусьці не дадзены вершы Алеся Гурло совецкага перыяду, а вядома, што большасць сваіх твораў ён напісаў пасля рэволюцыі.

35 год беларуская паэзія самааддана служыць самай перадавой ідэі свету. У яе баявым арсенале — дасцільныя, сапраўды народныя байкі выдатнага совецкага драматурга Кандрата Крапівы. Хоць большасць з іх напісана ў дваццатыя гады, але і сёння не ржавее лязо крапіўоўскай сатыры, бо і сёння нам патрэбны гогалі і шчэдрыны. У арсенале нашай паэзіі — цудоўная, непаўторная праца Аркадзя Куляшова, паэзія глыбокачалавечная, наватарская, партыйная ў сапраўдным сэнсе гэтага слова, надзвычай сугучная часу.

Мы і сёння чуем усхваляваны голас чалавека, які не пасцёў ва ўсю шырыню разгарнуць свае творчыя магчымасці, чуем і разумеем шчырую мару Паўлюка Труса аб «краі дымных фабрык і машын», якая паспяхова ажыццяўляецца ў наш час.

У Анталогіі змешчаны лепшыя творы Петруся Броўкі — «Палессе», «Кастусь Каліноўскі», «Ясны гут», «Хлеб», «Родныя берагі». Даўна, што ў кнігу не ўключаны праграмны, наватарскі твор Броўкі — паэма «Праз горы і стэп».

Трэба было-б у Анталогіі пазнаёміць рускага чытача з паэмамі Пятра Глебкі «Мужнасць» і «У тыя дні» — творамі, напісанымі на адказнейшыя партыйныя тэмы.

У Анталогію ўключаны амаль цэлы зборнік (57 вершаў) нашага лепшага паэта Максіма Танка. Трэба сказаць, што большасць перакладаў яго твораў зроблены на добрым мастацкім узроўні.

Гэтак-жа добра прадстаўлены ў кнізе вершы і паэмы Піліпа Пестрака і Валянціна Таўлая. Асабліва вызначаюцца пераклады твораў Таўлая, зробленыя Канстанцінам Сіманавым і Якавам Хелемскім.

Недастаткова пададзена ў Анталогіі творчасць Максіма Лужаніна, Васіля Віткі і Аляксея Зарыцкага.

Варта было-б шырэй пазнаёміць чытача з таленавітай паэзіяй Кастуся Кірэенкі, Міхася Калачынскага. Міколы Аўрамчыка, а таксама прадставіць у кнізе творчасць Аляксея Высіна, Міхася Пенкрата і другіх паэтаў.

Міхась Васілёк — старэйшы паэт былой Заходняй Беларусі. Шмат якія яго творы атрымалі шырокае прызнанне чытача. Анталогія-ж знаёміць нас толькі з вершамі Васілька, напісанымі пасля 1939 года.

На гэты раз пашанцавала сапраўднай, наватарскай паэзіі Пімена Панчанкі. Большасць яго вершаў добра перакладзена Міхаілам Святловым.

Панчанка — паэт, які вельмі сур'ёзна і сурова ставіцца да кожнага свайго слова. А вось мы чытаем у вершы «Першыя кулі», перакладзеным С. Ойслендэрам, безгустоўныя радкі, якія мусім пакінуць толькі на сумленні перакладчыка:

Земля к небесам взметнется
Кровавым вихрем гранат...

Або:

Ты слышишь — приказ суровый
Земные диктуют недра...
(«Першыя кулі»).

А вось у таго-ж, як ні дзіўна, Святлова:

Я давно присягнул, что приду, обниму
Каждый милый вершок моего
белорусского края...
(«На роднай зямлі»).

Шмат пярэчанняў выклікаюць кароткія біяграфічныя даведкі аб аўтарах. Вядома, што Мікола Сурначоў загінуў смерцю храбрых у 1945 годзе ў час штурму Берліна. Аб гэтым гаворыцца ў біяграфічнай даведцы, але некаторыя вершы Сурначова чамусьці датыраваны 1947 годам. Піліп Пестрак у 1940 годзе быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, а не БССР, як сведчыць даведка. У Анталогіі няма вершаў Уладзіміра Шахаўца, а ў кнізе чамусьці дадзена яго біяграфія. Дарэчы, вершы Шахаўца варта было-б уключыць у Анталогію, хоць у апошні час ён працуе ў галіне прозы.

Многа блытаніны і ў падборцы вершаў Міколы Аўрамчыка. Перабытаны строфы ў вершы «Шахцёрка». Верш «Над магілай краснадонцаў» названы «Над могилой красноармейцев».

Не варта было ўключаць у гэтую Анталогію некаторыя пераклады з ленінградскай Анталогіі, зробленыя не зусім удала. («Адлёт жураўлёў» К. Кірэенкі і інш.).

Няпоўна, на маю думку, пададзена ў Анталогіі багатая народная творчасць беларусаў у раздзелах «Дарэволюцыйныя песні», «Совецкія песні», «Песні беларускіх партызан».

Усе гэтыя нешматлікія хібы таксама мусім пакінуць на сумленні рэдактараў і ўкладальніка.

«Анталогія беларускай паэзіі» — выдатная з'ява ў гісторыі совецкай культуры. Гэтая кніга сведчыць аб непарушнай дружбе вялікага рускага народа, яго культуры, якая сёння здзіўляе свет, з брацкім беларускім народам, з нашай культурай, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу.

„ПОЛЫМЯ“ № 9

«Дзень добры, школа!» — так называецца новая аповесць Міколы Гамолкі, якой адкрываецца часопіс. Піліп Пестрак надрукаваў працяг рамана «Сустрэнемся на барыкадах» (частка чацвертая). Вялікай будоўлі комунізма прысвечаны нарыс С. Сямёнава «Дняпро працуе на комунізм».

Паэзія ў нумэры прадстаўлена цыклам вершаў Максіма Танка: «Выканана партыі заданне», «Прамова ў дзень адкрыцця помніка партызанам», «Я хацеў-бы», «З тых дзён», «Мне пару крылдало юнацтва», «Ля гэтых сосен», «Мост над Свіслаччу», вершамі К. Буйлы — «Праўда», «На беразе Інчона» і А. Гарэліка — «Брату», «Чайкі над Цымлянскім морам».

У аддзеле публіцыстыкі і крытыкі змешчаны артыкул С. Майхровіча «Беларуская літаратура XIX стагоддзя» і А. Есакова «Больш твораў драматургіі для дзяцей».

Часопіс друкуе рэцэнзіі М. Модэля «Праўда аб латышскім народзе» (пра кнігу В. Лаціса «Да новага берага») і Я. Зомерфельда «Апавяданні Янкі Маўра».

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАВАЛЁЎ, Аляксей КУЛАКОЎСКІ, Пімен ПАНЧАНКА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Праспект імя Сталіна, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мастацтва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і бухгалтэрыі 2-54-45.

АТ 27449 Друкарня «Чырвоны друкар», г. Мінск, Рэвалюцыйная 12.